

ПАДВОДНЫЯ КАМЯНІ ІНШАЗЕМНАГА ШЛЮБУ 5

ТАЯМНІЧАЯ ШЧЫТАПАДОБНАЯ ЗАЛОЗА 13




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

1 ЧЭРВЕНЯ 2022 г.
СЕРАДА
№ 105 (29727)



МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Анатоль ЛІНЕВІЧ, памочнік Прэзідэнта — інспектар па Віцебскай вобласці:**

*«Для вырашэння праблем і дакладнага выканання трэба разумець, як чалавеку жывецца ў тых ці іншых умовах. Рабіць як для сябе — да кожнай праблемы трэба прымяняць такі падыход. Многія пытанні вырашаюцца аператыўна, на месцах, але не заўсёды ў той меры, якая задавальняе людзей. Для гэтага трэба часцей сустракацца з насельніцтвам, цікавіцца яго патрэбамі і апярэджваць звароты да мясцовай улады».*

# ВОЛЬНЫЯ, ЯК ВЕЦЕР



Фота Віктара ДРАЧОВА.

**Вучні сярэдняй школы № 27 г. Мінска: першы дзень школьных канікул.**

## КОРАТКА

• **Новы цалкам электрыфікаваны дзіцячы сад «Жамчужынка» адкрыўся ў Шклове.**



• Дзень электратранспарту пройдзе ў Мінску 17 чэрвеня.

• **Прамая лінія аб добраахвотнай назапашвальнай пенсіі пройдзе на сайтах Мінпрацы і БелТА 9 чэрвеня.**

• Сёння ва ўсіх аддзяленнях «Белпошты» пройдзе дзень пасткросера.

• **Абітурыенты БДУ змогуць адначасова падаць дакументы на спецыяльнасці розных факультэтаў.**

З нагоды

## МАТЭРЫЯЛЬНА І НЕ ТОЛЬКІ

### Якія меры падтрымкі дзяцей дзейнічаюць у краіне

**У Беларусі 1 мільён 847 тысяч дзяцей, а гэта 20 % насельніцтва. Кожнае пятае дзіця выхоўваецца ў шматдзетнай сям'і. Пра сістэму дзяржаўнай падтрымкі непаўналетніх расказалі спецыялісты напярэдадні Міжнароднага дня ахова дзяцей.**

### Атрымліваюць дзярждапамогу

Для матэрыяльнай падтрымкі сем'яў з дзецьмі ў нашай краіне функцыянуе сістэма дзяржаўных дапамог. Іх 11 відаў. Самыя значныя — аднаразовая дапамога пры нараджэнні дзіцяці і штомесячная — па доглядзе дзіцяці да трох гадоў. Апошняя прызначаецца незалежна ад даходаў сям'і і выплаты страхавых узносаў. Аднаразовая дапамога пры нараджэнні першага дзіцяці складае 10 БПМ, на сёння гэта больш за тры тысячы рублёў. Пры нараджэнні другога і наступных дзяцей такая выплата складае ўжо 4,5 тысячы рублёў (14 БМП).

Штомесячная дапамога па доглядзе дзіцяці да трох гадоў перавышае мінімальны заробак і складае на першае дзіця 35 % ад сярэдняй заработнай платы работніка за квартал. Сёння гэта 540 рублёў. На другое дзіця — 617 рублёў (40 % сярэдняй зарплаты), на дзіця-інваліда — 694 рублі.

СТАР. 12

Кібербяспека

## ВІРТУАЛЬНАЯ АГРЭСІЯ:

### ахвяры, хейтары, назіральнікі...



**Непрыемныя паведамленні і каментарыі ў інтэрнэце, здзекі анлайн, запужванне і пагрозы, распаўсюджванне плётак ці паклёпу, у тым ліку з дапамогай фота, выключэнне асобы з нейкіх груп ці анлайн-гульняў, стварэнне фэйкавых акаўнтаў або спецыяльных груп для цкавання... Усе гэтыя з'явы — праявы кібербулінгу: цкаванне і пераслед з дапамогай электронных прылад і рэсурсаў, якіх з часам і развіццём тэхналогій, пэўна, будзе станавіцца яшчэ больш. Пры гэтым нельга казаць, што з'яўленне інтэрнэту зрабіла свет больш небяспечным — проста цяпер з усімі рэальнымі пагрозамі і рызыкамі можна сутыкнуцца ў сеціве, сцвярджаюць спецыялісты. Падчас фестывалю «Школа, вольная ад насілля (булінгу)», які прайшоў у аздараўленчым лагеры «Зубраня», яны расказалі, як пазнаць кібербулінг і што варта рабіць, каб пераадолець праблему інтэрнэт-цкавання.**

СТАР. 5


ISSN 1990 — 763X



ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на ІІІ квартал і ІІ паўгоддзе

Мы абяцаем нясумнае лета з любімай газетай

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

З першых вуснаў

# «МЫ ПАВІННЫ ЎМЕЦЬ ВЕСЦІ КОНТРПРАПАГАНДУ, ЯК У САВЕЦКІМ САЮЗЕ»

**Пытанні ўдасканалення інфармацыйнай палітыкі, прапановы ўлады па барацьбе з фэйкамі і контрпрагандзе разгледзелі на нарадзе ў Прэзідэнта Беларусі. Да абмеркавання запрасілі дзяржсакратара Саўбеза Аляксандра Вальфовіча, яго першага намесніка Паўла Мурабейку, кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Ігара Сергеенку і яго намесніка Ігара Луцкага, міністра абароны Віктара Хрэніна, старшыню КДБ Івана Тэртэля, прэс-сакратара Прэзідэнта Наталлю Эйсмант.**


Фота БелТА.

Улады будуць абараняць беларусаў у інфармацыйнай прасторы, выкарыстоўваючы метады контрпрапаганды і агітацыі. «Самае галоўнае — мы павінны ўмець весці контрпрапаганду, як яе называлі раней у Савецкім Саюзе. Я і сёння не адмаўляюся ад гэтага. Так, гэта — контрпрапаганда. Не трэба палохацца слова «прапаганда». Мы прапагандуем найлепшае. Мы агітуем за найлепшае. Раней аддзелы прапаганды і агітацыі былі ў ЦК партыі і да райкамаў. Прапагандавалі свой лад жыцця, вялі барацьбу, расказвалі пра ўсё, чым мы ганарыліся. І сёння так і адбываецца. Толькі з нас пасмейваюцца: «Прапагандысты, агітатары». Чаму пасмейваюцца? Каб нас збіць з толку», — упэўнены Аляксандр Лукашэнка.

Паводле яго слоў, няма нічога страшнага, калі краіна будзе прапагандаваць свой вобраз жыцця і агітаваць за яго. «Але трэба навучыцца весці контрпрапаганду супраць той прапаганды, што разгорнута супраць нас. Неабходна выпрацаваць механізмы процідзеяння, контрмеры», — заявіў Прэзідэнт.

«Да гэтай тэмы звяртаемся не ўпершыню. Таму што яна працягвае быць актуальнай ці проста працягвае быць. Ціск на нас у гэтай сувязі ўзмацняецца, таму і супрацьдзеянне павінна з нашага боку быць адпаведным», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Усе запрошаныя на нараду, як ён абазначыў, людзі дастаткова дасведчаныя, з прычыны сваёй прафесійнай дзейнасці кожны паглыблены ў сутнасць падзей, якія адбываюцца ўнутры краіны і вакол.

«Вы ведаеце, што выклікі, з якімі мы сёння сутыкаемся, — абсалютна не новая гісторыя, — акцэнтаваў кіраўнік краіны. — Вось ужо амаль трэць стагоддзя мы будуем сваю дзяржаву і пастаянна падвяргаемся ідэалагічным, інфармацыйным, ваенным і псіхалагічным пагрозам. Знаходзімся фактычна пад гэтым прэсам з боку, як модна зараз казаць, калектыўнага Захаду, Вашынгтона і яго саюзнікаў».

Па словах Прэзідэнта, намеры палітычных апанентаў вядомыя: дэстабілізаваць грамадства, змяніць канстытуцыйны лад і прывесці да ўлады неабходных Захаду людзей.

«Узровень тэхналогій, кінутых на рэалізацыю гэтых мэт, сёння вельмі высокі. Неабходна разумець, што людзі, якія сочаць за навінамі, не заўсёды ў стане аддзяліць праўду ад хлусні. Калі не з'яўляешся рэальным удзельнікам падзей, атрымліваеш велізарную колькасць інфармацыі ў выглядзе хлусні і фэйкаў. Бывае сапраўды складана аддзяліць праўду ад хлусні», — дзеліцца меркаваннем Аляксандр Лукашэнка.

Ён выказаў думку, што на Захадзе палітыку даўно ператварылі ў пастановачнае кіно, шоу, і людзі там прызвычаіліся да такога фармату падачы інфармацыі, таму праўда часам не цікавая.

«Цікавыя — фэйкі, шоу, бо прыгожа пастаўлена, — дадаў Прэзідэнт. — Як я казаў, рэальнасць часам сумная. Не такая яркая, як хлусня і фэйкі. І ў гэтым галоўная праблема. У выніку мы бачым, што нават прымітыўна сфабрыкаваныя сюжэты прымаюцца людзьмі на веру. А любая «негарачая», гібрыдная вайна — вайна за розумы людзей», — падкрэсліў кіраўнік краіны.

Самая небяспечанае, дадаў ён, што ўсе негатыўныя інфармацыйныя дзеянні на Беларусь ажыццяўляюцца з выкарыстаннем псіхалагічных аперацый, методык уздзеяння на свядомасць людзей.

«Мы глядзім на Украіну і разумеем, што там разгортваецца сцэнарый, не рэалізаваны на нашай зямлі. Калі задаюць пытанне: «А што было б з намі?» — калі ласка, глядзіце на Украіну. Журналісты нашы выдатна зразумелі гэта і тлумачаць людзям. Мы бачым узровень пагроз, актыўнасць якіх усяго толькі перамясцілася на тэрыторыю суседняй краіны», — рэзюмаваў Прэзідэнт.

**Марыя ДАДАЛКА.**

## Каментарый у тэму

**Ігар СЕРГЕЕНКА, кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта,** адзначыў, што Беларусь ужо які год жыве і працуе ва ўмовах інфармацыйнай вайны, калі на грамадзян ільюцца патокі хлусні з разнастайных замежных тэлеграм-каналаў. Такая няпраўдзівая інфармацыя, па яго словах, прадстаўлена па самых розных кірунках: міжнародная палітыка, сітуацыя ва Украіне, санкцыі.

«У гэтым свеце інфармацыі складана часам разабрацца, дзе хлусня, а дзе — праўда. Адзін з вядомых замежных палітыкаў мінулага стагоддзя адзначыў так: «Хлусня паспявае абысці паўсвету, пакуль праўда нацягвае штаны». Супрацьстаяць і супрацьдзейнічаць хлусні і фэйкам у эфіры дастаткова складана. Неабходна працаваць па многіх напрамках з апярэджаннем, даваць праўдзівую інфармацыю раней хлусні, тлумачыць, паказваць. Таму сёння на нарадзе ішла размова, як удасканальваць гэтую работу, як актывізаваць нашых журналістаў, тэлевізійныя каналы, у якіх напрамках творча і цікава падаваць інфармацыю, займаючыся прапагандай і контрпрапагандай», — сказаў Ігар Сергеенка.

Па яго словах, на сустрэчы абмяркоўвалі, як на практыцы рэалізоўваць мерапрыемствы на інфармацыйным фронце вайны.

«Вызначылася агульная стратэгія і канкрэтныя формы работы, — дадаў спікер. — Забараняльных мер не разглядалася. У сродках масавай інфармацыі можна гаварыць многае, але галоўнае — несці за гэта адказнасць, у першую чаргу перад грамадствам і законам».

Ігар Сергеенка мяркуе, што ў грамадства ёсць запыт на праўду, але яно, грамадства, разбэшчана фэйкавай інфармацыяй.

«Фэйкавая інфармацыя ўспрымаецца як шоу. Калі следам крочыць праўда, ёй складана прабіцца. Але ведаем адно: усе зацікаўлены атрымліваць і арыентавацца на праўдзівую інфармацыю», — рэзюмаваў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта.

# «ВЕЛЬМІ ВЫСАКАРОДНАЯ СПРАВА ДЛЯ ВАЕННАГА ЧАЛАВЕКА — БЕЗ ШУМУ, БЕЗ СТРЭЛАЎ ВЯРНУЦЬ ДЗЯСЯТКІ ЛЮДЗЕЙ ДАДОМУ»

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка ўчора ўручыў супрацоўнікам КДБ, якія ўдзельнічалі ў спецаперацыі ва Украіне, медалі «За адзнаку ў воінскай службе, паведаміла прэс-служба кіраўніка краіны.**


Фота БелТА.

Падчас уручэння ўзнагарод Прэзідэнт раскрыў некаторыя падрабязнасці праведзенай імі спецыяльнай аперацыі ва Украіне. «У нас сёння незвычайны фармат, хоць вы заслугоўваеце, напэўна, самых добрых слоў і самых яркіх пазіцый у сродках масавай інфармацыі. Але не я ж выбіраў жыццё для вас. Вы выбралі такое жыццё, такую службу. Я вам вельмі ўдзячны за гэта. Гэта сапраўдная мужчынская служба», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Асаблівыя словы падзякі супрацоўнікам КДБ кіраўнік дзяржавы выказаў за паспяховае правядзенне аперацыі па вызваленні дзясяткаў беларускіх грамадзян, якія знаходзіліся фактычна ў палоне на тэрыторыі Украіны.

«Відавочна, не па сваёй волі яны апынуліся заложнікамі, і не толькі сітуацыі, але і асобных жаданняў самых дрэнных людзей ва Украіне. Калі пачалася спецаперацыя Расійскай Федэрацыі, нашы людзі, некалькі дзясяткаў, засталіся там, прама скажам, заложнікамі сітуацыі. І іх трэба было вяртаць дадому, у сем'і. Вельмі высакародная справа для ваеннага чалавека — без шуму, без стрэлаў вярнуць дзясяткі людзей дадому. Таму я вам празмерна ўдзячны за ваш учынак», — прыадкрыў некаторыя падрабязнасці Прэзідэнт.

Ён са шкадаваннем адзначыў, што двум беларусам так і не пашчасціла вярнуцца дадому. Да пачатку аперацыі спецслужбаў яны загінулі. «Прыйдзе час, мы разбяромся і з гэтым, — заявіў Аляксандр Лукашэнка. — Я памятаю, тады сказаў пра тое, што калі нам не вернуць хлопцаў, то мы правядзём у тым ліку і вострую спецаперацыю для вызвалення нашых хлопцаў. Камітэту дзяржбяспекі было даручана падрыхтаваць гэтае мерапрыемства і вызваліць нашых людзей. Пры вашым непасрэдным удзеле, пад вашым кіраўніцтвам была ажыццёўлена гэтая аперацыя без адзінага стрэлу. Па-мойму, ва Украіне так ніхто і не разабраўся, як гэта здарылася», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Па словах **дзяржаўнага сакратара Савета бяспекі Аляксандра ВАЛЬФОВІЧА**, узнагароджаныя выконвалі задачы ў сферы забеспячэння нацыянальнай бяспекі, але, на жаль, імёны, прозвішчы і абставіны аператыўнага задання раскрыць нельга.

«Такая спецыфіка службы. Але важна галоўнае: гэтыя хлопцы правялі ўнікальную спецыяльную аперацыю па вызваленні нашых грамадзян з чужой тэрыторыі. Грамадзян Беларусі было шмат, каля 70 чалавек. Яны аказаліся фактычна ў палоне, іх жыццю і здароўю пагражала небяспека», — сказаў Аляксандр Вальфовіч.

Паводле яго, унікальнасць аперацыі і ў тым, што байцы маглі прымяніць зброю, але спецзаданне было ажыццёўлена настолькі прафесійна, што яна не спатрэбілася.

«Яны не зрабілі ніводнага стрэлу і вывезлі нашых грамадзян з тэрыторыі чужой краіны, вярнулі гэтых людзей у сем'і, дамы. Гэтыя хлопцы праявілі сапраўды гераізм, адвагу, выканалі з годнасцю гэту аперацыю», — дадаў суразмоўца.

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Bloomberg: уступленне Фінляндыі і Швецыі ў НАТА стане стратэгічным кашмарам для альянсу

**ЗША і НАТА, запрашаючы Фінляндыю і Швецыю ў альянс, не ўлічваюць патэнцыяльныя выдаткі такога плана, паведамляе Bloomberg.**



Ёсць толькі дзве відавочныя прычыны для ўступлення гэтых дзвюх скандынаўскіх краін у НАТА. Першая — абсалютна сімвалічная, якая павінна прадэманстраваць еўрапейскую салідарнасць на фоне падзей ва Украіне. Другая прычына мае тэхнічны характар: Фінляндыя і Швецыя з'яўляюцца членамі ЕС, аднак у выпадку ваеннай небяспекі яны не могуць быць абаронены, як астатнія дзяржавы, якія ўваходзяць у Еўрасаюз і з'яўляюцца членамі НАТА. Аднак ва ўсіх іншых адносінах пытанне членства Фінляндыі і Швецыі ў НАТА з'яўляецца складаным і трывожным, лічыць Bloomberg.

Фінляндыя і Швецыя, вядома, маюць развітую эканоміку. Яны маглі б унесці свой уклад у развіццё НАТА. Яны таксама больш моцныя ў ваенных адносінах, чым некаторыя іншыя еўрапейскія дзяржавы. І ўсё ж Фінляндыя і Швецыя ўжо даўно сканцэнтраваліся ў ваенным плане на абароне сваіх тэрыторый, што выклікае сумненні ў іх каштоўнасці для ўдзелу ў агульнай абароне, якая пакладзена ў аснову статута НАТА.

І хоць абедзве краіны абавязаліся павялічыць свае ваенныя расходы на агульную абарону Еўропы, таксама магчыма, што яны гэтага не зробяць. Замест гэтага яны могуць бясплатна карыстацца ваеннай магутнасцю ЗША — яе ядзерным парасонам, — як шэраг іншых еўрапейскіх дзяржаў рабілі на працягу многіх гадоў.

## У Савеце Федэрацыі заявілі, што ў Захаду скончыліся ідэі санкцый супраць Расіі

**Лідары краін ЕС узгаднілі шосты пакет санкцый супраць Расіі, у які ўвайшло частковае эмбарга на імпарт расійскай нафты. Прэм'ер Эстоніі Кая Калас ужо заявіла аб неабходнасці разгледзець сёмы пакет санкцыйных мер. У гутарцы з «Газетой.Ru» першы намеснік старшыні камітэта Савета Федэрацыі па міжнародных справах Уладзімір Джабараў выказаў меркаванне, што ў Еўрасаюза наўрад ці атрымаецца прыдумаць новыя санкцыі, якія змаглі б даць дзейсны вынік.**

«Я адразу зрабіў бы 25 пакетаў, чаго пакутаваць? Мне здаецца, яны ўжо не ведаюць, што прыдумаць. Я чытаю гэтыя санкцыі з шасці пакетаў і, шчыра кажучы, не магу прыдумаць, што б з іх боку яшчэ можна было б зрабіць такога, каб нам было дрэнна. Я думаю, што гэта ад бяссілля. Таму што яны былі ўпэўнены, што пасля першага, ну максімум пасля другога пакета эканоміка Расіі абрынецца, і ўсё будзе разарвана на шматкі. Аднак гэтага не адбылося. І долар не каштуе 200 рублёў, як заяўляў Байдэн, і ў крамах усе паліцы набітыя таварамі, і цэны не растуць, і камуналка тая ж самая практычна засталася», — сказаў сенатар.

Джабараў дадаў, што «чым больш пыжацца» краіны Захаду, імкнучыся нашкодзіць Расіі, тым больш яны шкодзяць самі сабе.

Парламенцкі дзённік

# ДАПАМОГА ІНВАЛІДАМ, АБАРОНА ПЕРСАНАЛЬНЫХ ДАНЫХ І ЗАХАВАННЕ КАДРАВАГА ПАТЭНЦЫЯЛУ

## Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў разгледзелі шэраг законапраектаў

**Каля 14 тысяч працоўных мігрантаў з 80 краін прыбылі на тэрыторыю Беларусі за мінулы год. Аб гэтым, прадстаўляючы ў першым чытанні законапраект аб знешняй працоўнай міграцыі, паведаміў міністр унутраных спраў Іван КУБРАКОЎ. Пры гэтым кіраўнік міліцэйскага ведамства адзначыў, што на тэрыторыі нашай краіны прагназуецца павелічэнне працоўнай міграцыі.**

— Па нашых падліках, толькі па бязвізе да нас за тры месяцы з Літвы і Латвіі прыбыло каля 45 тысяч чалавек, — заўважыў міністр унутраных спраў. — Людзі прыязджаюць, ацэньваюць наш узровень жыцця, умовы працы. Мы можам меркаваць, што колькасць працоўных мігрантаў павялічыцца.

Як падкрэсліла **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Вольга ПЕТРАШОВА,** палітыка Рэспублікі Беларусь у сферы знешняй працоўнай міграцыі пастаянна ўдасканальваецца. «І адной з задач гэтай палітыкі з'яўляецца абарона нашых грамадзян, якія працуюць за мяжой, — заўважыла парламентарый. — Прадугледжана ўвядзенне норм, што будуць абараняць замежных грамадзян, якія працуюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь. Калі паглядзець аналіз структуры імпарту, экспарту працы, то колькасць замежных грамадзян, якія прыязджаюць працаваць на тэрыторыю нашай краіны, мае тэндэнцыю да зніжэння, а колькасць працоўных мігрантаў, якія выязджаюць працаваць за мяжу, — да павелічэння. Вельмі своечасовае сёння прынясце комплексу мерапрыемстваў, якія будуць садзейнічаць, у першую чаргу на заканадаўчым узроўні, захаванню кадравага патэнцыялу нашай краіны, прыцягненню прафесійных, кваліфікаваных кадраў з-за мяжы ў нашу краіну».

Палажэнні Закона «Аб знешняй працоўнай міграцыі» не будуць дзейнічаць на замежных грамадзян, якія падаюжаюць працаваць на тэрыторыі Беларусі, будучы ўдзельнікамі студэнцкіх атрадаў, сезонных сельскагаспадарчых работ, пераможцамі і лаўрэатамі міжнародных конкурсаў. Таксама навоўвядзенні не будуць распаўсюджвацца на прафесійных спартсменаў і трэнераў. Удасканаляцца і падыходы да рэгламенту працаўладкавання нашых грамадзян за мяжой. Гэтая навацыя і многія іншыя, па словах Вольгі Петрашовай, будуць садзейнічаць удасканаленню імпарту і экспарту працоўнай сілы.

У першым чытанні дэпутаты прынялі законапраект «Аб змяненні законаў» (па пытаннях абароны персанальных даных). Як расказаў **міністр унутраных спраў Іван КУБРАКОЎ,** абарона персанальных даных, інфармацыйная бяспека з'яўляецца адным з галоўных пытанняў у МУС. Цяпер, па словах кіраўніка міліцэйскага ведамства, у кожным абласным упраўленні ўнутраных спраў прадугледжаны падраздзяленні, якія займаюцца непасрэдна толькі абаронай інфармацыі. Акрамя таго, створана падраздзяленне, якое ў кругласутачным рэжыме забяспечвае інфармацыйную бяспеку.

— Сёлета было шмат спроб несанкцыянаванага доступу да інфармацыйных баз, — заўважыў Іван Кубракоў. — Усе яны былі паспяхова адбіты. Па гэтых фактах праводзяцца праверкі сумесна з нашымі калегамі з іншых сілавых структур.

Праект закона «Аб змяненні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб зваротах грамадзян і юрыдычных асоб», адобраны дэпутатамі ў другім чытанні, накіраваны на далейшае ўдасканаленне прававога рэгулявання адносін, якія датычацца сферы падачы і разгляду зваротаў грамадзян і юрыдычных асоб з мэтай найбольш поўнай абароны іх правоў і законных інтарэсаў.

— У сваім родзе гэта ўнікальны дакумент, аналагаў якому не існуе ў заходніх краінах, — акцэнтавала ўвагу **член Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Наталля ТАРАСЕНКА.** — З яго дапамогай у нас у Рэспубліцы Беларусь выбудоўваецца канструктыўны дыялог паміж уладай і грамадствам па вырашэнні самых надзённых пытанняў і праблем. Адной з яркіх навацый законапраекта з'яўляецца змяненне парадку падачы электронных зваротаў. У апошнія гады іх колькасць, у параўнанні з пісьмовымі і вуснымі, значна вырасла. Прапануецца, каб электронныя звароты ўносіліся праз Дзяржаўную адзіную (інтэграваную) рэспубліканскую інфармацыйную сістэму ўліку і апрацоўкі зваротаў грамадзян і юрыдычных асоб. Такім чынам яны будуць трапляць у дзяржаўныя органы і дзяржаўныя арганізацыі.

Па словах дэпутата, звароты грамадзян — індыкатар жыцця выбаршчыкаў у рэгіёнах. «Мы бачым праблемы, якія ўзнікаюць перад нашымі выбаршчыкамі, і разумеем, у якім кірунку дзейнічаць у рэгіёнах, — удакладніла Наталля Тарасенка. — Любая праблема на месцах можа стаць сістэмнай, якой будзе дастаткова для таго, каб пэўны законапраект яе ўлічыў».

У другім чытанні парламентарыі прагаласавалі і за законапраект «Аб правах інвалідаў і іх сацыяльнай інтэграцыі». Ключавыя наваўвядзенні дакумента накіраваны на паўнапраўнае ўключэнне людзей з інваліднасцю ў грамадства, а таксама рэалізацыю дзяржаўнай палітыкі сацыяльнай інтэграцыі інвалідаў, стварэнне даступнага асяроддзя і паляпшэнне якасці жыцця інвалідаў, падтрымку сем'яў з інвалідамі.

Як паведаміла **старшыня Пастаяннай камісіі па працы і сацыяльных пытаннях Людміла КАНАНОВІЧ,** уводзяцца такія новыя паняцці, як мова жэстаў, універсальны дызайн, асістэмныя сістэмы і тэхналогіі, зразумелая мова. «Гэта тыя паняцці, якія сёння неабходныя для таго, каб жыццядзейнасць людзей з інваліднасцю была забяспечана, — канстатавала дэпутат. — Законапраектам прадугледжана кватаванне працоўных месцаў. Варта адзначыць і такую сур'ёзную навацыю, як удасканаленне механізму ўзаемадзеяння на мясцовым узроўні. Існуе Рэспубліканскі савет па правах інвалідаў. Мы пойдзем далей — і такія саветы будуць ствараца на абласным і раённым узроўнях. Вельмі важна, каб на мясцовым узроўні праблемы інвалідаў вырашаліся своечасова».

Акрамя таго, з мэтай стварэння камфортных умоў для карыстання паслугамі сацыяльнай інфраструктуры, прадугледжваецца стварэнне новага інфармацыйнага рэсурсу — аўтаматызаванай інфармацыйнай сістэмы па ўліку даступнасці аб'ектаў сацыяльнай інфраструктуры. Актуальныя звесткі аб іх даступнасці будуць кансалідавацца ў інфармацыйнай сістэме і аўтаматычна перадавацца для размяшчэння на публічнай кадастравай карце, даступнай для ўсіх грамадзян у інтэрнэце.

Падтрымалі дэпутаты і законапраект «Аб змяненні законаў па пытаннях прававой аховы аб'ектаў інтэлектуальнай уласнасці», разгледжаны ў першым чытанні. Парламентарыі ратыфікавалі дамову паміж Беларуссю і Расіяй аб супрацоўніцтве ў сферы мытні, а таксама пратаколы да пагаднення аб адзіных прынцыпах і правілах абарачэння медыцынскіх вырабаў у межах ЕАЭС, пагаднення па пытаннях свабодных эканамічных зон на тэрыторыі Мытнага саюза, пагаднення аб парадку абмену звесткамі, якія ўваходзяць у склад крэдытных гісторый, у межах ЕАЭС. У другім чытанні былі разгледжаны законапраекты аб аказанні псіхалагічнай дапамогі, аб абыходжанні з адходамі і аб іпатэцы.

**Вераніка КАНЮТА.**

Адкрыты дыялог

# Наперадзе шмат добрых спраў

**Прапанова стварыць для беларускага студэнцтва свой храм прагучала падчас круглага стала з моладдзю, які адбыўся на базе Рэспубліканскага маладзёжнага цэнтра ў Студэнцкай вёсцы ў Мінску. Удзел у ім прынялі міністр адукацыі Андрэй ІВАНЕЦ, Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Веніямін, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі, рэктары БДУ і БДУІР Андрэй КАРОЛЬ і Вадзім БОГУШ і Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Аляксандр РУМАК.**



Як вядома, пры Маскоўскім дзяржаўным універсітэце дзейнічае Дамавы храм святой пакутніцы Таціяны, якая лічыцца заступніцай студэнтаў. І менавіта студэнцкая моладзь складае большую частку яго прыхаджан. Асабліва часта студэнты заходзяць у храм падчас сесій, перад экзаменамі. Пытанне наконт адкрыцця падобнага храма ці капліцы пры БДУ было адрасавана яго рэктару Андрэю Каралю.

— Насамрэч гэта тэма абмяркоўвалася яшчэ падчас падпісання пагаднення з Беларускай праваслаўнай царквой пэўны час таму. Хачу падкрэсліць, што гэта не проста мемарандум, а дакумент, напоўнены канкрэтным зместам. Вядома, сесія для студэнтаў — гэта святое, і калі ёсць такая патрэба, мы можам дапамагчы ім, каб падчас экзаменаў Гасподзь пачуў іх малітвы, — пажартаваў Андрэй Кароль. — А калі сур'ёзна, то я папрасіў бы міністра адукацыі падключыцца да гэтага пытання. На тэрыторыі Беларусі дзейнічаюць розныя канфесіі, і гэта трэба ўлічваць... БДУ — вельмі вялікі універсітэт, мы маем патрэбу і ў вучэбных карпусах, і ў інтэрнатах. Таму без дапамогі нам не абысціся...

Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Веніямін, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі, падзяліўся са студэнтамі сваімі ўспамінамі і расказаў, што калісьці і сам ставіў свечкі ў храме перад сур'ёзнымі экзаменамі. І яму гэта заўсёды дапамагала. Таму, на яго думку, варта прыслухацца да моладзі... Міністр адукацыі Андрэй Іванец прапанаваў паглядзець на пытанне больш шырока і паспрабаваць увасобіць жаданне студэнтаў — мець свой храм — на тэрыторыі Студэнцкай вёскі, магчыма, з прыцягненнем Міжнароднай асацыяцыі выпускнікоў ВНУ.

Пра што яшчэ ішла размова падчас адкрытага дыялогу? Студэнты, напрыклад, ініцыіравалі правядзенне спартыўных турніраў паміж ВНУ і духоўнымі семінарыямі, і ўвогуле яны лічаць не зусім правільным, што гэтыя ўстановы вельмі закрытыя ад грамадства. Кажуць, што хацелася б ведаць пра іх больш. Прапанавалі валанцёрскую дапамогу па навядзенні парадку на тэрыторыях цэркваў з маленькім прыходам і стварэнне віртуальных экскурсій па беларускіх храмах накшталт праекта «Віртуальная Каложа», які прэзэнтавалі ў рамках выставы студэнты Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы. Аляксандр Румак падтрымаў гэту ідэю. На яго думку, добра, калі віртуальная экскурсія падштурхне маладых людзей наведаць храм, бо, каб адчуць яго непаўторную атмасферу, трэба ўсё ж такі знайсці час і магчымасці для асабістага візіту....

Выстава-прэзэнтацыя студэнцкіх сацыяльных праектаў, якая папярэднічала адкрытаму дыялогу, аказалася вельмі цікавай. Ад БДУ на ёй былі прадстаўлены ініцыятывы гістарычнага факультэта «Дыялог культур і рэлігій» і «Памяць і слава». Апошні праект накіраваны на захаванне памяці аб прафесарах і выкладчыках універсітэта. Перш за ўсё студэнты шукалі інфармацыю пра чалавека, а потым месца, дзе ён пахаваны. Для гэтага праводзілі пошукавыя работы на Усходніх, Вайсковых, Чыжоўскіх і Кальварыйскіх могілках у Мінску. Затым знойдзеныя пахаванні добраўпарадкавалі, складалі інтэрактыўную карту пахаванняў. Таксама ў рамках праекта быў створаны дакументальны цыкл фільмаў «Памяць і слава». Кожнаму некропалю прысвечана адна з 20-хвілінных серый.

БДПУ прэзэнтаваў праект «Святло душы», скіраваны на далучэнне студэнцкай моладзі да нацыянальнай культуры, фарміраванне маральных каштоўнасцяў шляхам батлеечнага мастацтва, адраджэння традыцый беларускага лялечнага тэатра, выхаванне духоўна-маральных і традыцыйных сямейных каштоўнасцяў.

Азнаёміўшыся з прадстаўленымі праектамі Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Веніямін, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі, падкрэсліў: «Усё тое, што робіцца сёння, радуе, натхняе, але яшчэ ёсць куды развівацца. Наперадзе чакае яшчэ шмат добрых спраў: валанцёрскі рух, вывучэнне гісторыі роднага краю, знаёмства з духоўнымі і культурнымі традыцыямі беларускага народа. Усе гэтыя праекты згуртуюць моладзь і зробяць яе жыццё насычаным і адухоўленым. Клопат аб душы павінен быць на адным з першых месцаў».

Андрэй Іванец лічыць супрацоўніцтва з праваслаўнай царквой вельмі плённым: «Акрамя адукацыйнай, на нас ляжыць і выхаваўчая функцыя. Фарміраванне духоўнасці, традыцыйных сямейных каштоўнасцяў — гэта тая работа, якую мы праводзім з дашкольнага ўзросту. У школах для вучняў 5—6-х класаў арганізаваны факультатыў па духоўна-маральным выхаванні. А зараз завяршаецца распрацоўка адпаведных факультатываў і для старшакласнікаў. Студэнцкая моладзь таксама цікавіцца пытаннямі, якія датычацца духоўнага развіцця. І сёння ў рамках наведвання Рэспубліканскага маладзёжнага цэнтра і Студэнцкай вёскі мы змаглі пераканацца, што практычна ўсе нашы ўстановы вышэйшай адукацыі ўключаны ў гэту работу...»

**Надзея НІКАЛАЕВА, фота аўтара.**

# «СТУДАТРАДАЎСКІ РУХ — НАЙЛЕПШАЕ, ШТО СУЧАСНЫ БЕЛАРУСКІ РЭСПУБЛІКАНСКІ САЮЗ МОЛАДЗІ ЎЗЯЎ АД КАМСАМОЛА»

**Чарговы герой рубрыкі — другі сакратар ЦК БРСМ, куратар рэспубліканскага студатрадаўскага руху Аляксандр ПРАХАРАЎ. Як вясковы настаўнік гісторыі стаў значнай асобай самай буйной маладзёжнай арганізацыі краіны, які конкурс на месца ў найлепшыя працоўныя атрады Беларусі і ад чаго спяваюць сэрцы студатрадаўцаў — у новым інтэрв'ю «Плеяды маладых».**




***— Аляксандр, што, на ваш погляд, уяўляе сабой сучасны студатрадаўскі рух?***

— Гэта вельмі магутны рух, які аб'ядноўвае штогод дзясяткі тысяч маладых людзей. Справа іх рук — не разавыя «акцыі» і не выключна заробкі, а магчымасць быць датычным да ўзвядзення знакавых аб'ектаў краіны. Сярод іх — Нацыянальная бібліятэка, Мінск-Арэна, стадыён «Дынама», Аўгустоўскі канал, Музей ВАВ, Беларуская АЭС. На мой погляд, студатрадаўскі рух — найлепшае, што сучасны Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі ўзяў ад камсамола.

> **«Гісторыя дапамагае будаваць прычынна-выніковыя сувязі, аналізаваць сённяшнія падзеі, вывучаючы мінулае, прадбачыць, як мы будзем развівацца далей».**

***— Каб стаць студатрадаўцам, неабходна быць членам БРСМ?***

— Кожны малады беларус мае магчымасць прыняць удзел у гэтым руху, але ў нас ёсць конкурс на ўступленне ў атрад. У найлепшыя — дзесьці сем чалавек на месца. Такому конкурсу могуць пазайздросціць многія ВНУ. Прыярытэт аддаецца актывістам саюза моладзі, але членства ў БРСМ не абавязковая ўмова.

***— Як тады запісацца ў студатрад?***

— Мы распрацавалі маладзёжны прома-праект «Выбірай студатрад» для ўсіх навучальных устаноў. Малады чалавек запаўняе анкету, якую перадае ў пярвічную арганізацыю БРСМ. Там ён адзначае працягласць сваёй работы, сферу пажаданай дзейнасці, чаканні па заробку. Летась мы апрабавалі ў Мінску чат-бот, праз які можна было пакінуць заяўку на ўступленне ў студатрад. Ён добра сябе паказаў, і сёлета мы распаўсюдзілі такую форму на ўсю Беларусь. Акрамя таго, на сайце БРСМ ёсць анлайн-прыёмная, дзе таксама можна пакінуць заяўку.

***— Колькі ўжо ахвотных атрымаць месца працы?***

— Мы атрымалі ўжо больш за 27 тысяч заявак.

***— І ўсіх зможаце ўладкаваць?***

— У мінулым годзе мы працаўладкавалі 34 тысячы маладых людзей. Увогуле, ставім амбіцыйную задачу — зрабіць Рэспубліканскі штаб студэнцкіх атрадаў маладзёжным цэнтрам занятасці.

***— Верагодна, самае папулярнае пытанне — колькі можна зарабіць у студатрадзе?***

— Студатрады — гэта не толькі пра грошы, але і пра асаблівую атмасферу. Калі казаць пра канкрэтныя лічбы, то яны добрыя. Па-першае, у студатрадах ільготныя падаткі (ад падаходнага падатку вызвалены). Другое — заробкі залежаць ад профілю. Самыя высокія ў будаўнікоў. У цэлым, сёння на рэспубліканскіх праектах заработная плата ад 750 да 1200 рублёў за поўны месяц.

***— На якіх прадпрыемствах і будпраектах задзейнічаюць студатрады сёлета?***

— Трэці год моладзь працуе на «Атланце» — уладкуем каля 300 чалавек на пазіцыю слесара-зборшчыка халадзільнага абсталявання. Упершыню будзем працаваць на Мінскім трактарным заводзе і Мінскім аўтамабільным заводзе. Выходзім на новы ўзровень супрацоўніцтва з Беларускай чыгункай. Нас чакаюць манцёрамі пуцей і праваднікамі. Будуць нашы хлопцы і дзяўчаты важатымі ў лагеры «Зубраня», прапагнуць будаваць сацыяльныя аб'екты ў Астраўцы. Усебеларускай маладзёжнай будоўляй стане ўзвядзенне музея ў Хатыні.

Гэты год знакавы выхадам на міжнароднае супрацоўніцтва, у першую чаргу з Расіяй. На конкурснай аснове наша моладзь з Наваполацка прайшла на міжнародную студэнцкую будоўлю ў Кузбасе. Мы ўдзельнічаем у некалькіх усерасійскіх студбудоўлях на нафтагазавых аб'ектах у Якуціі і Ямала-Ненецкай аўтаномнай акрузе. Зараз вядзём перамовы аб удзеле нашых студэнцкіх атрадаў ва ўзвядзенні аб'ектаў на касмадроме «Усходні». Магчыма, ужо ў гэтым годзе наша моладзь адправіцца туды.

***— Вы кажаце, што студатрады — гісторыя не пра грошы. А што тады прыцягвае моладзь?***

— У нашай краіне створаны ўсе ўмовы для развіцця студатрадаўскага руху. Кіраўнік дзяржавы ўдзяляе гэтаму асаблівую ўвагу. Дзякуючы яго асабістай падтрымцы, дзяржава дае дзіўную магчымасць дакрануцца да будаўніцтва і рэканструкцыі найважнейшых знакавых аб'ектаў. Быць удзельнікам руху з дзясяткам тысяч чалавек дарагога варта. Узаемавыручка, мэтанакіраванасць, адказнасць за справу — гэта пра сучасныя студатрады. Удзел у студатрадаўскім руху прадугледжвае не толькі працу, але і культурную, спартыўную, экскурсійную праграмы. Падчас працы моладзь спаборнічае ў спорце, мастацтве і вытворчых паказчыках — так выбіраецца найлепшы атрад. Моладзь пасля цяжкага працоўнага дня наватпіша песні. Штогод у нас з'яўляецца дзясяткам песень ад студатрадаў. Што іх схіляе да гэтага? Рамантыка, яднанне.

***— Вы таксама былі студатрадавец. У якіх праектах самі прымалі ўдзел?***

— З маімі калегамі мы будавалі малочнатаварныя комплексы ў Віцебскай вобласці. Гэта таксама значная дапамога ва ўмацаванні харчовай бяспекі краіны. Я ганаруся тым, што некалі быў датычны да студатрадаўскай дзейнасці.

***— Вы з сям'і педагогаў. Чаму працягнулі дынастыю?***

— Складанае пытанне... Гісторыя мне падабалася заўсёды. Цікава сачыць за развіццём краін і сацыяльнымі працэсамі. Ды і педагогіку лічу адной з самых гуманных прафесій, якая закладвае падмурак яшчэ ў школе. Да пераезду ў Мінск я сумяшчаў працу ў БРСМ з настаўніцкай практыкай — выкладаў гісторыю. Няхай калегі не скардзяцца, але гэта самы важны прадмет. Гісторыя дапамагае будаваць прычынна-выніковыя сувязі, аналізаваць сённяшнія падзеі, вывучаючы мінулае, прадбачыць, як мы будзем развівацца далей.

***— Вы гарадскі жыхар, віцябчанін. Але першым месцам вашай работы пасля ВДУ імя П. М. Машэрава была школа ў невялікім аграгарадку Бабінічы. Як гэта — быць маладым настаўнікам у вёсцы?***

— Сёння вёска ўжо не тая, што 30—40 гадоў таму. Вясковыя дзеці ні ў чым не абмежаваны: ні ў доступе ў інтэрнэт, ні ў спадарожнікавым тэлебачанні, ні ў іншай інфраструктуры. Як маладому спецыялісту мне адразу далі класнае кіраўніцтва. Я нёс адказнасць не толькі за сябе, але і за тых 17 чалавек, што былі ў маім класе. А там кожны са сваімі інтарэсамі, асаблівасцямі характару, трэба да кожнага знайсці асаблівы падыход. З-за пражывання ў сельскай мясцовасці дзеці больш звязаны з працай. З імі было камфортна. Тут пытанне не ў тым, як гэта, а ў тым — якія людзі побач. Мне пашчасціла з дырэктарам школы Таццянай Камароўскай. Яна многаму навучыла.

> **«У нас ёсць конкурс на ўступленне ў атрад: у найлепшыя — дзесьці сем чалавек на месца».**

***— Вы, зразумела, былі актыўным студэнтам, верагодна, добра вучыліся. Чаму для размеркавання выбралі вясковую школу?***

— Лічу, што, калі ты зрабіў свядомы выбар прафесіі, адвучыўся пяць гадоў, неабходна паспрабаваць сябе. І пасля пяці гадоў нельга казаць, што выбар быў няправільны. Пра што ты тады думаў гэтыя пяць гадоў?! Але я і хацеў працаваць з дзецьмі. Казаць, што жыццё маладога настаўніка нецікавае, нияскравае — падман.

***— Як вы трапілі ў БРСМ?***

— Пасля вучобы ў Акадэміі кіравання я атрымаў пасаду ў ідэалагічным аддзеле Наваполацкага гарвыканкама, дзе адказваў за моладзь горада. Праз час мне прапанавалі паспрабаваць сябе ў якасці кіраўніка шматтысячнай Наваполацкай гарадской арганізацыі БРСМ. Запыт і патрабаванні да кіраўніка былі высокія, але згадзіўся. Мяне абралі на пасаду, дзе працаваў тры з паловай года.

***— Чаму Наваполацк называюць маладзёжнай сталіцай краіны?***

— У мяне вельмі добрыя ўспаміны пра Наваполацк, шмат што з ім звязана. Мая жонка з Наваполацка. Гэта самы малады горад краіны. Калі паглядзець гісторыю, то з Наваполацка і пачаўся студатрадаўскі рух у Беларусі. Наваполацк — горад ударнай усесаюзнай будоўлі.

Спачатку горад каля нафтаперапрацоўчага завода не планавалася. Меркавалі, што на працу людзі будуць дабірацца з Полацка. Але маладыя камсамольцы вырашылі заставацца тут. Так і пачалося будаўніцтва горада. Самая вялікая вуліца і зараз называецца Маладзёжная. Ды і горад дастаткова малады. Прысутнічае маладзёжны дух. Зразумела, што горад, які калісьці будавалі камсамольцы, сёння мае найлепшыя студэнцкія атрады ў Беларусі і стаў адным з лідараў у рэалізацыі дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі.




З байцамі студатрадаў Магілёўскай вобласці.

***— Аляксандр, якія хобі ў намесніка кіраўніка самай буйной маладзёжнай арганізацыі краіны?***

— Як і ў любога хлопца: спорт — футбол, баскетбол, плаванне. Але часу на гэта, зразумела, мала. Шмат камандзіровак, сустрэч, перагавораў. Праца 24/7. Выхадных няма, бо часта мерапрыемствы мы ставім на гэтыя дні. Люблю гісторыю. Калі ёсць магчымасць, вывучаю архіўныя дакументы па гісторыі роднай краіны.

***— Пагаворым пра вашу сям'ю. Вы бацька двух сыноў...***

— Так, у нас блізняткі, ім па чатыры гады.

***— А па характары яны розныя?***

— Верагодна, больш пра гэта скажа мая жонка. Жартую, але, ведаеце, іх настрой і паводзіны адрозніваюцца па тыднях. Гэты тыдзень больш спакойны Паша, другі тыдзень, наадварот, ён больш балаўнік. Быццам усё з ног на галаву перакульваецца: Кірыл стаў Пашам, а Паша — Кірылам. Але ўвогуле па характары падобныя і вельмі сябруюць, заступаюцца адзін за аднаго.

***— Чым бы вы хацелі, каб у дарослым жыцці займаліся вашы дзеці?***

— Мне не важна, якую спецыяльнасць абяруць, калі гэта будзе ім цікава. Іншае пытанне — якімі яны будуць людзьмі, з якімі чалавечымі якасцямі.

***— Нядаўна міністр адукацыі на сустрэчы з Прэзідэнтам выдаў мару Аляксандра Лук'янава, кіраўніка БРСМ, паляцець у космас. А якая мара ў вас?***

— Ведаеце, трэба ставіць амбіцыйныя мары, якія сваёй плённай працай магчыма дасягнуць. Верагодна, я хацеў бы, каб мае бацькі ганарыліся мной як сынам, а дзеці ганарыліся як бацькам. Важна, каб і ад тваёй штодзённай працы была канкрэтная карысць.

***— Як спецыяліст, які перыяд у гісторыі можаце назваць самым значным для нашай краіны?***

— Мне падабаецца час Полацкага княства, ВКЛ. Але ў нас кожны перыяд гісторыі знакавы яркімі падзеямі. Нам ёсць чым ганарыцца як у мінулым, так і ў сучаснасці.

***— Як вы думаеце, падзеі апошніх гадоў заслужаць асобнага параграфа ў падручніках па гісторыі Беларусі гадоў праз 20?***

— Мне здаецца, што ў параграфе будзе пра супрацьстаянне Захаду і Усходу, якое сёння ідзе адкрыта. Пасля Другой сусветнай вайны казалі пра двухпалярны свет. З аднаго боку быў магутны Савецкі Саюз, а з іншага — заходні свет і ЗША. З развалам Саюза ўсе загаварылі пра існаванне аднапалярнага свету, дзе парадак дыктаваў Захад. Думаю, у падручніку будзе асаблівы раздзел, як беларусы сваёй працавітасцю, адзінствам і згуртаванасцю чарговы раз годна супрацьдзейнічаюць любым цяжкасцям.

***— Многія героі нашай рубрыкі не любяць гэтае пытанне і асабліва калі я кажу слова «дэвіз». У вас ёсць нейкі выраз, які адлюстроўвае вашы прынцыпы па жыцці?***

— Мне падабаецца выраз з «Дванаццаці подзвігаў Геракла»: «Толькі слабыя ўздыхаюць пра тое, што ўжо адбылося і плачуць аб незваротным. Той жа, хто моцны душой, імкнецца згладзіць мінулае добрымі справамі ў будучыні». І таксама да душы тое, як казаў Прэзідэнт на сустрэчы з піянерамі і моладдзю краіны: «Толькі наперад».

**Марыя ДАДАЛКА.**
**Фота з архіва героя.**

# ВІРТУАЛЬНАЯ АГРЭСІЯ:
## ахвяры, хейтары, назіральнікі...

### За забаўку — рэальнае пакаранне

Калі кагосьці аднойчы абразілі — гэта насілле, калі гэта адбываецца з кімсьці, хто не можа сябе абараніць, сістэматычна і перыядычна, — гэта булінг. У канфлікце вінаватыя абодва бакі, а ў булінгу ахвяра невінаватая, што б яна ні рабіла і як бы сябе ні паводзіла. Канфлікт, як правіла, цягнецца не надта доўга і можа вырашыцца — бакі пагавораць і дамовяцца. Булінг жа можна толькі спыніць — ахвяра не можа дамаўляцца з крыўдзіцелем, патлумачыла **Таццяна КОЛАС, педагог-псіхолаг Рэспубліканскага цэнтра псіхалагічнай дапамогі БДПУ імя М. Танка:**

— Людзі часта канфліктуюць у інтэрнэце, і часам канфлікт цяжка адрозніць ад кібербулінгу. Аднак у апошняй з'явы маюцца прыкметы. Пры булінгу заўжды ёсць агрэсія і насілле. Такія сітуацыі крыўдзіцель паўтарае намерана і перыядычна. Пры гэтым булер заўжды мацнейшы (неабавязкова фізічна, а проста больш папулярны, мае больш падпісчыкаў і г. д.). Аднак часам кібербулінг можа пераходзіць у рэальнае жыццё, калі да ахвяры прымяняюць фізічнае насілле.

Няма адназначнага адказу, чаму адбываецца цкаванне ў сеціве. Крыўдзіцелі могуць кіравацца рознымі прычынамі, аднак мэта іх адна — пакрыўдзіць ахвяру. Некаму проста сумна, і ён такім чынам забаўляецца, не думаючы пра наступствы. Для некага гэта спосаб помсты ці зайздрасці. А хтосьці хоча даказаць свой аўтарытэт ці пераадолець уласную няўпэўненасць за кошт абразы іншых.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



— Цкаванне ўсё часцей пераходзіць у інтэрнэт, бо гэта не так прыкметна. Цкаваць некага ў рэальным жыцці складана — гэта могуць заўважыць іншыя і спыніць. У інтэрнэце рабіць так значна прасцей: наўрад ці хто на гэта зверне ўвагу і пакарае, — расказала псіхолаг. — Калі дзіця цкуюць у класе, пра гэта ведае клас ці паралель школы, калі ў інтэрнэце — пра гэта ведае значна больш людзей і крыўдзіцель яго могуць кругласутачна. Булеры смялейшыя ў віртуальнай прасторы, бо кіруюцца ілюзорным пачуццём бяспекі і ананімнасці. Аднак важна разумець, што любое дзеянне ў сеціве пакідае за сабой лічбавы след, і калі будзе разбор, то яго адшукаюць. За дзеянні ў віртуальным свеце прадугледжана пакаранне — у свеце рэальным.

### Караля робіць світа, або як ратавацца

У канфлікце заўжды прысутнічаюць тры бакі. Крыўдзіцель, ад якога сыходзіць агрэсія. Ахвяра, на якую скіравана агрэсія. І назіральнік, які не прымае ўдзелу ў канфлікце, аднак ускосна ўцягнуты ў яго, паколькі, хоць і не падтрымлівае крыўдзіцеля, аднак і не рэагуе і сочыць за тым, што адбываецца. Негатыўныя наступствы булінгу адбываюцца на ўсіх яго ўдзельніках, абазначыла Таццяна Колас:

— Караля робіць світа. Калі агрэсар піша нешта непрыемнае ахвяры, а на гэта ніхто не рэагуе і не лайкае, булер бачыць, што яго насмешкі ніхто не падтрымлівае. І неўзабаве гэта яму надакучыць, бо ён не адчуе ніякага трыумфу. Любому крыўдзіцелю, каб атрымліваць асалоду ад працэсу, патрэбны сведкі.

Калі вы падвяргаецеся булінгу, трэба памятаць, што абсалютна любая праблема мае рашэнне. Ні ў якім разе не вінавацьце сябе — гэта не з вамі нешта не так, а проста вы сталі зручнай ахвярай у пэўны момант. Не рэагаваць на каментары крыўдзіцеляў, каб не даваць эмацыянальнай рэакцыі і водгуку і не падсілкоўваць агрэсію булера, як бы ні хацелася адказаць, патлумачыла ці супярэчыць. Рабіць скрыншоты — як бы ні было крыўдна і прыкра захоўваць пра сябе негатыў: у будучыні, калі справа дойдзе да разбору з'явы, гэта дапаможа даказаць, што вас булілі. Заблакіраваць крыўдзіцеля — і лепш высветліць, дзе на сацыяльнай старонцы знаходзіцца такая функцыя, загадзя. Звярнуцца да адміністратара інтэрнэт-рэсурсу — яны адгукнуцца на просьбу і дапамогуць, бо ўсе зацікаўлены ў тым, каб на іх рэсурсе не было булінгу.

Часам немагчыма справіцца з булінгам у адзіночку, і неабходна, каб умяшаўся нехта трэці. Чалавеку збоку працей дапамагчы, асабліва калі гэта дарослы. Падзяліцца перажываннямі — неабходна звярнуцца да асобы, якой вы давяраеце і якая мае для вас аўтарытэт (сваякі, школьны псіхолаг ці яшчэ нехта), каб падзяліцца з ім праблемай. Урэшце, гэта можа быць і званок на лінію псіхалагічнай дапамогі. Дзейнічаць у рэальным жыцці: калі ахвяра, напрыклад, вучыцца з булерам у адной школе, можна расказаць аб праблеме класнаму кіраўніку, псіхолагу, адміністрацыі. Не баяцца рашучых дзеянняў — калі вы атрымліваеце прамыя пагрозы ці ўжо зрабілі ўсё, перайначае вышэй, трэба звяртацца ў міліцыю.

### Як абараніць сябе ад кібербулінгу

Забяспечыць бяспеку свайго акаўнта. Перш чым апублікаваць у інтэрнэце нейкую інфармацыю пра сябе, падумайце, навошта вы гэта робіце. Нельга ўказваць асабістую інфармацыю, накшталт лакацыі месца, дзе вы жывяце. Сачыце за сваёй інтэрнэт-рэпутацыяй, бо будучыя працадаўцы абавязкова прагледзяць, што вы змяшчаеце на сваіх старонках. Вытрымлівайце этыку стасункаў у сеціве, якая фактычна нічым не адрозніваецца ад паводзін у рэальным жыцці.

Калі нехта стаў сведкай цкавання ў інтэрнэце, гэта нельга ігнараваць. Можна падтрымаць ахвяру — неабавязкова пачынаць актыўна сябраваць з гэтай асобай. Дастаткова падысці да яе і пагаварыць і не пісаць нешта накшталт «не перажывай, з усімі такое здараецца». Не варта паддавацца агрэсіі і абараняць ахвяру, сварачыся з крыўдзіцелямі. Агрэсію нельга перамагчы агрэсіяй. Можна пачаць збіраць доказы кібербулінгу: рабіць скрыншоты, звярнуцца да адміністратара рэсурсу ці параіць зрабіць гэта ахвяры.

**Фота аўтара.**

### Наступствы кібербулінгу

Кожны з удзельнікаў — ахвяра, булер і назіральнік, — калі не будуць стараца змяніць сітуацыю, пачнуць мяняцца.

**Ахвяра** стане замкнёнай, злоснай і раздражнёнай, атрымае праблемы са здароўем (галаўны ці страўнікавы боль, бяссонніца, непрыманне ежы), у яе з'явяцца апатыя і суіцыдальныя думкі.

**Булер** (хейтар) будзе залежаць ад чужога меркавання, перастане давяраць іншым, стане канфліктным і будзе пастаянна баяцца пакарання.

**Назіральнік** (сведка) стане няўпэўненым у сабе, у яго пачнуць прытупляцца эмоцыі, ён будзе баяцца ператварыцца ў наступную ахвяру і адчуе віну за сваё бяздзеянне, пачне ўспрымаць насілле як норму.

---

Юрыдычная кансультацыя

# ПАДВОДНЫЯ КАМЯНІ ІНШАЗЕМНАГА ШЛЮБУ
## Як беларусцы даказаць, што яна ўдава афрыканца?

**Дзяўчына з невялікага райцэнтра Беларусі выйшла замуж за студэнта-афрыканца. У шлюбе ў іх нарадзіўся сын. Жыццё ішло. Але аднойчы муж паехаў на радзіму вырашаць нейкія сямейныя пытанні, а праз некаторы час яго сваякі даслалі паведамленне, што ён... памёр. Перажыўшы першы шок, жонка вырашыла атрымаць пасведчанне аб яго смерці, каб абазначыць свой статус удавы. Аднак сваякі мужа замест патрэбнага дакумента пасля яе шматлікіх просьбаў даслалі на пошту толькі копію медыцынскай даведкі з бальніцы, дзе ён памёр. Даведка таксама выглядала даволі дзіўна, зыходзячы з яе перакладу: даныя сужэнца супадалі толькі часткова, не былі ўказаны яго прозвішча і дата нараджэння, выклікала пытанні і пячатка бальніцы, якая дрэнна чыталася. Паехаць на радзіму мужа асабіста, каб атрымаць пасведчанне, жанчына не магла. Дарагі пералёт і адсутнасць якойсьці дапамогі з боку сваякоў мужа ніяк гэтаму не спрыялі. Каб выпатрабаваць даведку з радзімы мужа, яна звярнулася па дапамогу да спецыялістаў, і вось тут пачаўся сапраўдны дэтэктыў...**

### Сярод памерлых не значыцца

Шлюбаў з іншаземцамі ў нашай краіне заключаецца не сказаць, каб вельмі шмат, аднак у агульнай колькасці адносін, што рэгіструюцца, яны займаюць 7 працэнтаў. Спецыялісты штораз папярэджваюць жаніхоў і нявест, якія збіраюцца звязаць жыццё з замежнікамі, што, акрамя кахання і жадання, трэба мець яшчэ і ўяўленне аб сваіх правах і абавязках у інтэрнацыянальным шлюбе. Асабліва калі плануецца яшчэ і нараджэнне дзяцей. Тым не менш праблемы працягваюць з'яўляцца, і далёка не ўсе іх удаецца вырашыць.

— Паколькі з краінай, адкуль родам муж гераіні, у Беларусі не заключана Канвенцыя аб прававой дапамозе і прававых адносінах па грамадзянскіх, сямейных і крымінальных справах, выпатрабаваць пасведчанне аб смерці афіцыйна немагчыма. А даведка (у тым выглядзе, у якім яе атрымала жанчына) ад сваякоў памерлага мужа не мае юрыдычнай сілы, — патлумачыла **Крысціна ОБУХАВА, галоўны спецыяліст галоўнага ўпраўлення юстыцыі Гомельскага аблвыканкама**. — Разам з тым, каб аформіць свой юрыдычны статус пасля смерці мужа, ёй трэба мець на руках легалізаванае пасведчанне аб яго смерці. З дапамогай нашых дзяржорганаў мы накіравалі запыт кампетэнтным органам замежнай дзяржавы, якія пасадзейнічалі ў выпатрабаванні неабходнай інфармацыі. Аказалася, што афіцыйных звестак пра смерць сужэнца... няма.

Паколькі жанчына не можа паехаць на радзіму мужа, каб на месцы самастойна высветліць, што здарылася, і атрымаць неабходныя дакументы, яна можа падаць дакументы на развод.

— Скасаванне шлюбу ў дадзенай сітуацыі — бадай што адзінае выйсце. Абвясціць мужа ў пошук ці прызнаць яго памерлым у жанчыны не атрымаецца, паколькі ён іншаземны грамадзянін, які самастойна паехаў да сябе на радзіму. Тым больш што на сувязь выходзілі яго сваякі са сцвярджэннем, што ён не знік, а памёр, — падкрэсліла Крысціна Обухава.

### Скасаваць шлюб без мужа

Як беларусцы скасаваць шлюб з іншаземцам, калі ён адсутнічае ў Беларусі і дакладнае месцазнаходжанне яго невядомае, расказала **Галіна САСНОЎСКАЯ, адвакат Гомельскай абласной калегіі адвакатаў.**

Скасаванне інтэрнацыянальных шлюбаў, калі адзін з сужэнцаў — беларус, а другі — іншаземны грамадзянін (як і ўступленне ў шлюб) адбываецца ў нашай краіне згодна з заканадаўствам. Калі абодва сужэнцы пражываюць на тэрыторыі Беларусі, то развесціся яны могуць у агульным парадку. Адзін варыянт: па ўзаемнай згодзе шляхам падачы сумеснай заявы на скасаванне шлюбу ў загс (калі ў пары няма агульных непаўналетніх дзяцей і маёмасных спрэчак). Другі варыянт: развод судом па іску аднаго з сужэнцаў.

— Складанасці з разводам узнікаюць, калі сужэнец-іншаземец пражывае ў іншай краіне ці калі яго месцазнаходжанне невядомае. Пры скасаванні шлюбу з замежнікам, які пражывае ў іншай краіне, згодна з законам, неабходна звяртацца з іскавай заявай па месцы жыхарства адказчыка, іншымі словамі, у кампетэнтныя органы дзяржавы, дзе ён жыве. З гэтага правіла ёсць выключэнні. Існец можа звярнуцца з іскам аб скасаванні шлюбу ў суд па месцы свайго жыхарства, калі пры ім знаходзяцца непаўналетнія дзеці або калі з-за стану здароўя выезд па месцы жыхарства адказчыка для яго цяжкі.

Калі месца жыхарства сужэнца-іншаземца невядомае або ён не мае месца жыхарства ў Беларусі, то іск можна прад'явіць па месцы знаходжання маёмасці замежніка або па яго апошнім вядомым месцы жыхарства ў Беларусі.

— Са скасаваннем шлюбу заўжды цесна звязаны пытанні аб тым, з кім далей будуць пражываць агульныя непаўналетнія дзеці, а таксама пытанні, якія датычацца падзелу сумесна нажытай маёмасці, — звярнула ўвагу Галіна Сасноўская. — Спрэчкі аб далейшым пражыванні непаўналетніх вырашаюцца згодна з законам той краіны, дзе пражывалі сужэнцы з дзецьмі. Калі муж і жонка жылі ў розных дзяржавах, то ўлічваецца грамадзянства дзіцяці. Спрэчкі аб падзеле маёмасці сужэнцаў вырашаюцца згодна з заканадаўствам дзяржавы, дзе яны сумесна пражывалі. Калі муж і жонка валодаюць маёмасцю і ў Беларусі, і ў іншай краіне, то прыйдзецца звяртацца ў суды абедзвюх дзяржаў.

**Матэрыялы падрыхтавала Ірына СІДАРОК.**

## ЗАО «БелБанкротАукцион»,

организатор торгов по продаже имущества
УП «Пинская СПМК-5» (УНП 200111234),
объявляет о проведении **04.07.2022 г.** с 9.00 до 16.00
на электронной торговой площадке bankrottorg.by
электронных торгов в форме аукциона

Мастаўчанін Мікалай Ярц прысвяціў сваю драўляную Алёнку ўсім жанчынам. У ёй скульптар увасобіў найлепшыя іх рысы: мілавіднасць, прыгожы стан, схаваны за далікатнасцю моцны характар. На радасць усім мастаўчанам і гасцям горада будзе ўсталяваны Дзядуля Ох і яго залатая табакерка работы Святаслава Няхайчыка. Рэзчык Юрый Камандзірчык прадставіў у дрэве гісторыю Мастоў.

Таксама ў гарадскім парку з'явяцца Маша і мядзведзь, героі казак «Пакацігарошак» і «Людзей слухай, а свой розум май». Будуць тут яшчэ асілак, лесавік, ліса, дзяцел і варона з аднайменнай беларускай казкі, лясны дух, кот, які можа напужаць нават жыхароў лясной пушчы, і чорт з казкі «Чортаў млын». Усе ўдзельнікі пленэру атрымалі граматы і памятныя сувеніры ад намесніка старшыні райвыканкама Марыны Давыдзік.

# У прыярытэце — Дом культуры і набярэжная

## У Вялікай Бераставіцы пачалася маштабная падрыхтоўка да абласных Дажынак-2022

**Свята працаўнікоў сяла Гродзенскай вобласці адбудзецца 1 кастрычніка. На рэканструкцыю знакавых аб'ектаў з абласной інвестпраграмы выдаткавана больш за сем мільёнаў рублёў.**

Як паведамілі ў аддзеле эканомікі Берастаўвіцкага райвыканкама, плануецца поўнасцю аднавіць Дом культуры. Тут завершаны дэмантаж старога даху, вядзецца замена інжынерных сетак і камунікацый, перапланіроўка памяшканняў. У аднаўленым будынку з'явяцца зручныя грымёркі, душавыя, танцавальная зала. Будзе заменена механіка сцэны, тут набудуць новае гука-светлавое абсталяванне і музычную апаратуру. Новая глядзельная зала разам з балконам разлічана амаль на 320 месцаў. Дом культуры будзе больш даступны для людзей з абмежаванымі магчымасцямі — з пандусам, асобным санвузлом, прасторнымі ўваходамі і выхадамі.

Другі важны аб'ект рэканструкцыі — паркавая зона каля возера. З'явяцца два новыя вадаёмы, будуць пракладзены тратуарныя дарожкі. Ёсць планы адносна мастоў. Стары драўляны, які быў пабудаваны да 500-годдзя гарадскога пасёлка (2006 год), заменяць на новы, жалезабетонны, даўжынёй 30 метраў. Яшчэ адзін новы пешаходны мост з'явіцца ў раёне рынку.

Рэканструкцыя значна палепшыць сітуацыю з веларухам — для аматараў гэтага транспарту будуць вызначаны спецыяльныя дарожкі ўздоўж возера.

Да падрыхтоўкі абласнога фестывалю Дажынкі-2022 далучацца прадпрыемствы і сельгаспадаркі. Сельвыканкамы ва ўсіх аграгарадках правядуць работы па рамонце фасадаў будынкаў, агароджаў, дзіцячых пляцовак.


Фота beresta.by

# КНІГА ДЛЯ ДУШЫ, РАЗМОВА ПА СУТНАСЦІ...

## Людзі чакаюць бібліёбус і вырашэння бытавых праблем

**Прыезд бібліятэкі на колах стаў даволі звыклай з'явай для многіх жыхароў аддаленых вёсак Карэліцкага раёна. Але месцічы ведаюць: разам з кнігамі ў вёску прыедуць і прадстаўнікі розных службаў, напрыклад, райаддзела па надзвычайных сітуацыях і міліцыі. Далучаюцца і работнікі культуры. Магчымасцю сустрэчы карыстаюцца мясцовыя ўлады. Так адбылося і гэтым разам. Прыезд бібліёбуса стаў падставай для вясковых сходаў у Красненскім сельвыканкаме.**

Напрыканцы вясны мабільная бібліятэка праехала па маршруце Загор'е — Горная Рута — Кальчычы — Астухава — Навашына. Каб падарыць святочны настрой вяскоўцам, да вандроўкі далучыўся народны ансамбль песні «Забава» Карэліцкага раённага Цэнтра культуры і народнай творчасці.

Бібліятэкар са стажам Таццяна Рахманько расказвае, што ў зоне яе абслугоўвання больш за 30 вёсак. Усе яны размеркаваны па 10 маршрутах. Самы працяглы — пад нумарам чатыры, куды ўваходзіць пяць вёсак. Ёсць і вельмі малыя вёсачкі, як, напрыклад, Руднікі ці Альшаны, дзе пражывае ўсяго некалькі чалавек.

— Людзі чакаюць нас. Цікавяцца сучаснай прозай, у тым ліку і беларускай. Выбар даволі вялікі: гэта і мастацкія выданні, і часопісы. Мы ўжо больш-менш ведаем попыт нашых чытачоў і вязём кнігі адпаведна з іх запытамі. Ёсць і спецыяльныя часопісы, напрыклад, па садоўніцтве ці рукадзеллі. На любы густ. Шмат дзіцячай літаратуры, бо сярод чытачоў — 25 дзяцей. Літаратура даецца на рукі, а ў наступны прыезд мяняецца. Фонд нядрэнны, а калі чагосьці не хапае, мы можам заказаць кнігу нават у Нацыянальнай бібліятэцы. Быў такі выпадак, калі чалавеку спатрэбілася спецыфічная літаратура для навуковай працы, — тлумачыць бібліятэкар.

Бібліёбус выязджае ў раён некалькі разоў на тыдзень. Графік публікуецца ў раённай газеце. Да паездак далучаюцца прадстаўнікі РАУС, МНС, прафсаюза мясцовай гаспадаркі, работнікі культуры. А для сельвыканкамаў — гэта яшчэ адна магчымасць правесці міні-сход. Цяпер, пасля пандэміі, такая сувязь стала больш актыўная. Людзі ахвотна прыходзяць на сустрэчы, бо акрамя кніг, актуальнай інфармацыі можна даведацца аб вырашэнні некаторых надзённых пытанняў у мясцовай улады.


Фота Карэліцкай раённай бібліятэкі.

— Нядаўна прайшоў сход, дзе акцэнтавалася ўвага на папярэджанні пажараў, на бяспечных паводзінах дзяцей на вадаёмах. Наступае лета, дзятва прыязджае на канікулы ў вёску, да бабуль і дзядуляў, якія павінны несці за іх адказнасць, — зазначыла ў размове **старшыня Красненскага сельвыканкама Тамара ЛЯЙКО**.

Ёсць нямала пытанняў, якія хвалююць вяскоўцаў не адзін год. І самае набалелае — добраўпарадкаванне дарог. Тыя, што вядуць ад трасы ў вёску, і дарогі праз населены пункт. Многія з іх выклікаюць справядлівыя нараканні жыхароў.

— У сельскіх Саветаў на балансе дарог няма, яны знаходзяцца на абслугоўванні ДРБУ. І фінансаванне для іх амаль не выдзяляецца, яны быццам нічые. І таму гэта адна з асноўных праблем, — кажа старшыня сельвыканкама. — Мы па кожнай дарозе выходзім з хадайніцтвам, пішам заяву па звароце грамадзян. Вось, напрыклад, нам нядаўна прыйшоў адказ з дарожнага ўпраўлення, што будзе зроблены ямачны рамонт у ліпені — жніўні. Згодна з графікам, вядзецца грэйдзіраванне. У рамонце дарог дапамагае і мясцовая гаспадарка.

Актуальнае для сельскай мясцовасці пытанне і вывазу смецця. Сельвыканкам сумесна з ЖКГ вядуць работу па недапушчэнні забруджвання навакольнага асяроддзя. Вызначаюцца месцы для складзіравання смецця, адкуль потым камунальнікі яго вывозяць. Адпаведныя дагаворы заключаны з больш чым 90 працэнтаў насельніцтва. На летні перыяд дакументы афармляюцца з дачнікамі. Сельвыканкам скіраваны на тое, каб дагаворы па вывазе смецця мелі ўсе жыхары вёсак. Для людзей паслуга каштуе не дорага, хоць жыллёва-камунальнае прадпрыемства нясе па ёй пэўныя страты.

Па словах Тамары Ляйко, нямала зваротаў у сельвыканкам ад нашчадкаў, якія вяртаюцца ў бацькоўскія дамы і вырашаюць пытанні добраўпарадкавання сядзіб. Ёсць і такія, хто жадае набыць дом у маляўнічых мясцінах раёна. Побач і Нёман, і возера Свіцязь. Некаторыя купляюць дамы, якія перададзены сельвыканкамам, і пераязджаюць з горада ў вёску.

**Матэрыялы падрыхтавала Маргарыта УШКЕВІЧ.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.**

**www.zviazda.by**

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:** 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 311 17 35;

**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.**

**Тыраж 14.804. Нумар падпісаны ў 19.30 31 мая 2022 года.**

## Іван МЕЛЕЖ:

# «...ЖЫЦЦЁ АДДАЎ НАРОДУ»



Перапіска Саюза пісьменнікаў, яго кіраўнікоў з вышэйшай у рэспубліцы партыйнай інстанцыяй часам падводзіць да думкі, што, маўляў, кожны крок творчаму саюзу трэба было ўзгадняць. Можа, яно і так... Але ж пісьменнікі спадзяваліся на ЦК і з іншага пункту гледжання: у структураванай адміністрацыйна-партыйнай сістэме не проста ўзгадняліся тыя ці іншыя пытанні, а з ліста, са звароту ў ЦК КПБ, са звароту непасрэдна да Пятра Міронавіча Машэрава альбо да сакратара ЦК Аляксандра Трыфанавіча Кузьміна пачыналася выпрацоўка механізму вырашэння таго ці іншага пытання. «Хітрасць» была ясная і зразумелая ўсім: дасць ЦК «дабро» — і ў выніку падключацца органы ўлады на месцах, у справу будзе задзейнічаны ўрад, адпаведныя міністэрствы безапеляцыйна пачнуць займацца тым ці іншым патрэбным клопатам. Відавочна, што ўгаварыць кожную з інстытуцый спрычыніцца да вартай і патрэбнай грамадству айчыннай культуры, нацыянальнай літаратуры паасобку наўрад ці атрымалася б... Пункт гледжання ЦК, рашэнне ЦК, яго падказка — зусім іншая справа.

Вось і ў выпадку з ушанаваннем памяці народнага пісьменніка Беларусі Івана Мележа першы сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў БССР Ніл Гілевіч звяртаецца ў ЦК... 4 студзеня 1981 Ніл Сымонавіч падпісвае ліст да сакратара ЦК КПБ А. Т. Кузьміна...

«Паважаны Аляксандр Трыфанавіч!

8 лютага 1981 года спаўняецца 60 гадоў з дня нараджэння народнага пісьменніка Беларусі, лаўрэата Ленінскай прэміі Івана Паўлавіча Мележа.

Сваё кароткае жыццё ён цалкам аддаў служэнню роднаму народу, Савецкай Радзіме, Камуністычнай партыі, пакінуўшы багатую і непаўторную спадчыну, узнавіўшы ў мастацкіх вобразах этапныя перыяды няўхільнага поступу Кастрычніцкай рэвалюцыі па краіне. Творы яго вядомы людзям яшчэ са школьных гадоў, яны шырока перакладзены на мовы народаў СССР і многія замежныя.

Юбілейную дату Івана Мележа варта было б адзначыць шырока ў друку, па радыё і тэлебачанні, у школах, бібліятэках, палацах культуры і клубах, на радзіме пісьменніка і ў Мінску, дзе ён вучыўся і працаваў да апошніх дзён свайго жыцця.

У Мінску агульнагарадскі вечар, на наш погляд, варта было б правесці ў тэатры імя Янкі Купалы, на сцэне якога ішлі яго п'есы («Пакуль мы маладыя» і «Дні нашага нараджэння»), а таксама інсцэніроўка па рамане «Людзі на балоце». Гэты спектакль мог бы стаць мастацкай часткай вечара». Канкрэтная праграма... Праўда, ліст напісаны, што называецца, у самы-самы пярэдадзень юбілею... Чаму не звярнуліся раней? Мо баяліся, што навагоднія святы зблытаюць усе папярэднія планы? Мо разлічвалі, што нагадаць пра юбілей за месяц — час дастатковы?.. Хто ведае «кухню» праходжання афіцыйных папер у высокіх інстанцыях, задумаецца: а ці не сапраўды запозна звярнуліся... Адным словам, можна толькі такое апраўданне знайсці: маўляў, усё і без таго адладжана і будзе рухацца, адзінае, што трэба, — «добрая воля» ЦК партыі... Альбо — і ў самім Саюзе пісьменнікаў паставіліся да будучага юбілею фармальна, пра важкасць падзеі гаворку вялі на словах, не дужа рупячыся пра саму высокую падзею, якая змагла б прыцягнуць найбольшую ўвагу да класіка беларускай літаратуры, які «жыццё аддаў служэнню роднаму народу»...

Што ж вырашылі ў ЦК КПБ?.. Пытанне даручылі разгледзець двум аддзелам — культуры і прапаганды і агітацыі. На той час іх узначальвалі Іван Іванавіч Антановіч і Савелій Яфімавіч Паўлаў адпаведна. 23 студзеня яны падпісваюць службовую запіску... Чытаем, што ж было вырашана ўсяго за два тыдні да самога юбілею: «8 лютага 1981 г. спаўняецца 60 гадоў з дня нараджэння лаўрэата Ленінскай прэміі народнага пісьменніка Беларусі Івана Паўлавіча Мележа.

Саюз пісьменнікаў БССР увайшоў у ЦК КПБ з прапановай па правядзенню юбілею І. П. Мележа. Аддзелы культуры, прапаганды і агітацыі ЦК КПБ вывучылі дадзенае пытанне і лічаць мэтазгодным:

1. Стварыць камісію па падрыхтоўцы і правядзенню юбілею І. П. Мележа ў наступным складзе: Гілевіч Н. С. (старшыня камісіі), Нерад Н. С., Ульяновіч А. І., Быкаў В. У., Адамовіч А. М., Бураўкін Г. М., Дзялец М. І., Чыгрынаў І. Г., Яроменка М. М., Тоўсцік А. А., Сярноў Р. І.

2. Даручыць Мінскаму гаркаму КПБ сумесна з Саюзам пісьменнікаў БССР і Міністэрствам культуры БССР правесці агульнагарадскі ўрачысты юбілейны вечар І. П. Мележа 11 лютага 1981 г. у Беларускім дзяржаўным акадэмічным тэатры імя Я. Купалы. (Затраты па афармленні памяшкання тэатра і арганізацыі мастацкай часткі вечара (спектакль «Людзі на балоце») нясе Саюз пісьменнікаў БССР.)

3. Міністэрству культуры БССР, Міністэрству асветы БССР забяспечыць арганізацыю вечарын, кніжных выставак, прысвечаных 60-годдзю з дня нараджэння І. П. Мележа, у культустановах і школах рэспублікі.

4. Хойніцкаму РК КПБ сумесна з Саюзам пісьменнікаў БССР правесці юбілейныя мерапрыемствы на радзіме пісьменніка.

5. БелТА, рэдакцыям рэспубліканскіх газет, Дзяржаўнаму камітэту БССР па тэлебачанні і радыёвяшчанні забяспечыць асвятленне юбілею І. П. Мележа ў перыядычным друку, па тэлебачанні і радыё...»

Праграма, несумненна, цэласная і правільная... Кантроль наладжаны. Захавалася і такая запіска: «11 лютага 1981 г. адбудзецца юбілейны вечар, прысвечаны 60-годдзю з дня нараджэння І. Мележа. Просім прадоўжыць тэрмін выканання дакумента <...> да 12 лютага г.г.». Падпісаў запіску загадчык аддзела культуры ЦК КП Беларусі І. Антановіч. Унізе — 5 лютага — рэзалюцыя: «Тэрмін прадоўжыць да 12 лютага 1981 г.». На запісцы, якой дакладвалі сітуацыю два загадчыкі — І. Антановіч і С. Паўлаў, — рэзалюцыя па факце (падпісаў яе А. І. Бутэвіч): «Усе пункты выкананы ў поўным аб'ёме. Праведзены мерапрыемствы на радзіме І. П. Мележа, у школах, ВНУ. 11 лютага 1981 г. адбыўся агульнагарадскі вечар, прысвечаны 60-годдзю І. П. Мележа...»

З 1981 года мінула нямала часу. У 2021 годзе адзначалі ўжо 100 гадоў з дня нараджэння народнага пісьменніка Беларусі Івана Мележа. Аўтара неўміручых раманаў пра беларускую вёску згадвалі і ў друку, і на тэлебачанні і радыё. Самымі ўдзячнымі ў дачыненні да памяці пра Івана Мележа былі, канешне ж, землякі — жыхары Гомеля, Хойнікаў і Хойніцкага раёна. Варта згадаць, што ў Гомельскай абласной універсальнай бібліятэцы імя У. І. Леніна працуе ўнікальны па сваёй цеплыні, па насычанасці мемарыяльнымі рэчамі літаратурна-краязнаўчы музей, прысвечаны пісьменнікам Гомельшчыны. І ўвага ў яго экспазіцыі да Івана Мележа самая што ні ёсць шырокая...

Напамін пра старыя архіўныя «паперы» — гэта яшчэ і падказка нам, сённяшнім: «Не забыцца! Не забыць!..» Беларускае прыгожае пісьменства настолькі багатае і вартае ўвагі, што, мінаючы пэўныя вялікія даты стваральнікаў нацыянальнай літаратуры, мы ў выніку страчваем нешта важнае і сёння...

**Кастусь ЛЕШНІЦА.**

## Каб помнілі

# АРХІПАСТЫР НАРОДНЫ



40 дзён прамільгнула пасля спачыну архіепіскапа Пінскага і Лунінецкага Сцяфана. На сам гэты жалобны факт і пахаванне «Звязда» ўжо адгукалася змястоўнай у розных планах публікацыяй С. Яскевіч. Але, шануючы традыцыю, неабходна сказаць слоўца і на саракавіны. Таму, паводле народнай завядзёнкі, таксама бяруся падзяліцца згадкамі, хоць яны і не ўпарадкаваны так, як бы належыла.

З апошняга, што засела ў свядомасці, — атрыманае ад шаноўнага ўладыкі пісьмовае віншаванне з Пасхаю Хрыстовай. Такія на працягу гадоў ён прысылаў і раней. Але гэтае прыйшло акурат у той дзень, калі ён апынуўся пад раптоўным ударам немачы, і з малітвамі за яго выздараўленне мы звярталіся да Госпада і тады, калі Ён ужо забраў шчырага архіпастыра да Сябе...

А цяпер вярнуся да ранейшага. Гонар і задавальненне добра і досыць блізка ведаць пакойнага архіепіскапа мне дастаўся на пачатку 1990-х гадоў. З таго часу, дзякуючы ўвазе прыхільнага да свецкай інтэлігенцыі мітрапаліта Філарэта, маю маленькага — без належных заслуг, вядома, — пачалі ўключаць у розныя камісіі, саветы, аргкамітэты Беларускай праваслаўнай царквы. І вось там даволі непасрэдна кантактаваць з уладыкам Сцяфанам, які ў гэтых структурах, натуральна, меў далёка не шараговыя ролі. Згадваецца, як у свой час абмяркоўвалася, дзе ж рэальна перш за ўсё адбывалася Хрышчэнне беларускіх земляў, і як ухвальна пінскі архіерэй ставіўся да найбольш лагічнай версіі — якую падтрымлівалі П. Ф. Лысенка і ніжэйпадпісаны, — што з Кіева хрысціянства распаўсюджвалася па Дняпры, спачатку закрануўшы Тураўска-Пінскія землі. Дарэчы, і нядаўна зусім, калі ішла падрыхтоўка да 1030-годдзя праваслаўя ў Беларусі, ён падымаў гэтае пытанне, шукаючы падтрымкі.

Нагод сустракацца нам жыццё давала многа. Сярод іх, у прыватнасці, была экспедыцыя «Дарога да святыняў», у якой я многія гады браў удзел, а ўладыка «паломнікаў» заўжды гасцінна прымаў і шчодра частаваў. Кантактавалі мы і ў Мінскіх (дакладней Жыровіцкіх) духоўных школах, дзе епіскап Сцяфан выкладаў стала, а я па просьбе незабыўнага мітрапаліта Філарэта часова чытаў там спецкурс «Пераклад Свяшчэннага Пісання на беларускую мову». Некалькі разоў даводзілася выступаць з лекцыямі-прэзентацыямі кніг на выставах-кірмашах, якія з размахам, а таксама з выключнай увагай да ўдзельнікаў праходзілі пад непасрэдным кіраўніцтвам уладыкі Сцяфана ў Пінску і Баранавічах.

А гадоў пятнаццаць таму з'явілася тое, што можна было б назваць «сербскай лініяй». Досыць нечакана для мяне і адначасова цалкам заканамерна для ўладыкі Сцяфана. Як аказалася, у Духоўнай акадэміі ён вучыўся і сябраваў з двума сербамі, якія пазней таксама заслужылі архіерэйскую годнасць. І, магчыма, не без уплыву гэтай акалічнасці, правячы архіерэй пінскі на прастольнае свята ў свой кафедральны Свята-Варварынскі храм запрасіў тадышняга пасла Сербіі ў Беларусі п. Срэчка Джукіча, а з ім і мяне. Пасля гэтага мы разам наведвалі свята неаднойчы. А ўладыка Сцяфан наведваў Сербію. І там, дарэчы, узяў пад сваю апеку юнака-серба Аляксандра Будзішына, які, паспяхова скончыўшы Мінскую семінарыю і акадэмію, прыняўшы манашаскі пострыг (з імем Агафангел), стаў прарэктарам семінарыі. Між іншым не абрывалася таксама «сербская лінія» нашых з уладыкам адносін. У прыватнасці, ён мяне папрасіў зрабіць пераклады шэрагу богаслужбовых тэкстаў з сербскай мовы. Я, вядома ж, выканаў. За што атрымаў высокую ўзнагароду Пінскай епархіі — медаль св. вялікамучаніка Феадора Ціранa, жыціе якога, акафіст і малітву яму перакладаў.

Многае яшчэ можна было б прыгадаць. Дарэчы, з адказнасцю пацвярджаю сказанае С. Яскевіч. Больш за тое, удакладняю, што ўладыка Сцяфан меў багатую бібліятэку, прычым кнігі не проста калекцыянаваў, а сістэмна чытаў. І мову родную выдатна ведаў — гаварыў з выразным беларускім акцэнтам.

А завяршыць свае згадкі хочацца тым момантам, што найбольш уразіў. Такая вось «карціна» адкрылася мне, калі стаяў на салеі падчас літургіі ў Свята-Варварынскай царкве: на дзіва многа было там малых дзяцей, якія вольна пачуваліся ў храме, не трымаючыся за рукі мацярок ці бабуль, як звычайна; але ўжо сапраўдным дзівам было тое, што ўладыка, прычашчаючы малых, не пытаўся, як зваць, а сам называў іх імёны... Калі я потым запытаўся, ён гэта, пачуў сціплы адказ: «Ды я іх усіх добра ведаю». Што тут скажаш?! Падобным чынам уцаркаўленне дзетак можа праводзіць хіба што родны дзед. Альбо сапраўды народны пастыр. Думаецца, як у памяці маёй, так і многіх іншых, хто добра ведаў уладыку Сцяфана, ён застанецца менавіта народным архіпастырам.

Вечная памяць яму!

**Іван ЧАРОТА,**
**прафесар БДУ,**
**акадэмік Сербскай акадэміі навук і мастацтваў.**


### ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: 8 (0212) 24-63-12, 8 (029) 510-07-63.

**Продавец:** открытое акционерное общество «Витебскхлебпром», 210101, Витебская обл., г. Витебск, ул. Горбачевского, 5, тел. 8 (0212) 63-86-82.

**Лот № 1.** Изолированное помещение с инв. № 200/D-108263 площадью 297,4 кв. м, наименование – торговое помещение с рампой, назначение – торговое помещение, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, 22/2, пом. 87.

**Нач. цена:** 515 000,00 бел. руб. без учета НДС. Задаток: 51 500,00 бел. руб.

**Дата, время и место проведения аукциона: 04.07.2022 в 15.00 п**о адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и приема документов: с 01.06.2022 с 08.30 по 01.07.2022 до 17.30. Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».

**Задаток перечисляется на р/с ККУП «Витебский областной центр маркетинга» № BY93MTBK30120001093300066782, ЗАО «МТБанк», г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566.**

**Условия аукциона**: Победитель аукциона (единственный участник аукциона, выразивший согласие на приобретение предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) обязан: в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня проведения аукциона возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для проведения аукциона на р/с, указанный в протоколе аукциона, подписать договор купли-продажи в течение 11 рабочих дней с даты проведения аукциона, оплатить предмет аукциона в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи, оплатить НДС в размере 20 % сверх цены продажи предмета аукциона. *Расходы Продавца на проведение независимой оценки составляют 322,70 бел. руб. с НДС 20 %.*

**Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609.** Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивид. предпринимателем РБ – копия документа, подтверждающего гос. регистрацию юр. лица или индивид. предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юр. лица РБ – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивид. предпринимателя РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, руководитель юр. лица – также документ, подтверждающий его полномочия. Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона.

**Доп. информацию можно получить по тел.: (0212) 24-63-12, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by.** Ознакомиться с предметом торгов можно по предварительному согласованию с Продавцом по тел.: Попова Лариса Валентиновна, +375 (33) 399-81-70.

Утерянные свидетельство о государственной регистрации Общества с ограниченной ответственностью «Конструктор Красоты» (УНП 193390530), печать и Устав **признать недействительными.**

# МАТЭРЫЯЛЬНА І НЕ ТОЛЬКІ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

— Сем'ям пры нараджэнні другога дзіцяці і наступных выплачваецца дзве дапамогі: на дзіця да трох гадоў — у павышаным памеры і на дзіця ад трох да 18 гадоў — у памеры 50 % БПМ. Агульны памер дзвюх дапамог складае 770 рублёў у месяц, — расказала **кансультант упраўлення народанасельніцтва, гендарнай і сямейнай палітыкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Святлана КОВАЛЬ.**



Фота БелТА.

Усяго ў Беларусі сістэмай дапамог ахоплена больш за 420 тысяч дзяцей — кожнае чацвёртае ў краіне. У 2021 годзе расходы на іх выплату склалі 2,7 мільярда рублёў. Беларусь — адна з тых нямногіх краін, дзе ў адпачынку па доглядзе дзіцяці можна знаходзіцца да трох гадоў і атрымліваць увесь гэты час дапамогу. Можна працаваць на палову стаўкі ці дома і атрымліваць гэту выплату ў поўным памеры. Пры афармленні дзіцяці ў дашкольную ўстанову памер дапамогі таксама не мяняецца. У адпачынку па доглядзе дзіцяці цяпер знаходзіцца 225,7 тысячы чалавек.

Для шматдзетных сем'яў у Беларусі дзейнічае праграма па паляпшэнні жыллёвых умоў. На працягу года такія сем'і атрымліваюць накіраванне на будаўніцтва кватэр. Штогод больш за 12 тысяч шматдзетных сем'яў паляпшаюць свае жыллёвыя ўмовы. Летась гэта зрабілі 12 002 сям'і. Ім выдаткавана 128 мільёнаў рублёў крэдытных сродкаў і 342,3 мільёна субсідый.

## Нараджаюцца з дапамогай ЭКА

Беларусь займае 35-е месца сярод 175 краін свету па рэйтынгу шчаслівага дзяцінства, расказала **загадчык лабараторыі праблем здароўя дзяцей і падлеткаў РНПЦ «Маці і дзіця» Маргарыта ДЗЕВЯЛТОЎСКАЯ.** Наша краіна займае адно з вядучых месцаў у свеце па ўзроўні смяротнасці нованароджаных — яна ў нас рэкордна нізкая і складае 2,6 на 1 тысячу нованароджаных.

— У нас актыўна развіваюцца тэхналогіі, звязаныя з аказаннем дапамогі дзецям, якія нарадзіліся з экстрэмальна нізкай масай цела. Выжывальнасць дзяцей, якія нарадзіліся з вагой менш за 1,5 кілаграма, адна з самых высокіх у свеце і перавышае 83 %. Інвалідызацыя дзяцей, якія нарадзіліся з вагой менш за кілаграм, не перавышае 17-18 %, — расказала Маргарыта Дзевялтоўская.

У Беларусі штогод нараджаецца каля тысячы дзяцей з прымяненнем дапаможных тэхналогій, у прыватнасці ЭКА. Медыкі ажыццявілі 800 спроб бясплатнага ЭКА, з іх 500 у РНПЦ «Маці і дзіця». Эфектыўнасць — 40 %, гэта значыць, са 100 спроб 40 сталі паспяховыя.

## Здолелі вярнуць дзяцей у сям'ю

У 2021 годзе 1200 дзяцей засталіся без папячыцельства бацькоў з розных прычын.

— За апошнія 5—10 гадоў назіраецца дакладная тэндэнцыя па змяншэнні колькасці дзяцей, якія застаюцца без папячыцельства бацькоў па прычыне іх пазбаўлення бацькоўскіх правоў. З 2015 года іх колькасць скарацілася на 23 %. Не можа не радаваць і той факт, што бацькі наладжваюць адносіны з дзецьмі і вяртаюць іх у сем'і. Летась па прычыне аднаўлення ў бацькоўскіх правах вернуты ў сям'ю 105 дзяцей з замяшчальных сем'яў. А 95 бацькоў аднавіліся ў бацькоўскіх правах у аносінах да 124 дзяцей летась. У адносінах 10 бацькоў (невялікая колькасць, але кожны такі выпадак адметны) адменена рашэнне суда аб адабранні дзіцяці, — расказала **галоўны спецыяліст упраўлення сацыяльнай, выхаваўчай і ідэалагічнай работы галоўнага ўпраўлення выхаваўчай работы і маладзёжнай палітыкі Міністэрства адукацыі Алена СІМАКОВА.**

Колькасць замяшчальных сем'яў у Беларусі ў апошнія гады не павялічваецца, і звязана гэта з тым, што сёння меншая колькасць дзяцей мае патрэбу ва ўладкаванні ў такія сем'і. Пры гэтым у Беларусі функцыянуе 291 дзіцячы дом сямейнага тыпу, дзе выхоўваецца 1822 дзіцяці. Толькі 6 % з гэтых дзяцей з'яўляюцца біялагічнымі сіротамі, астатнія дзеці маюць бацькоў, якія не могуць займацца іх выхаваннем, бо не стварылі належныя ўмовы ці самі сталі крыніцай гвалту або пагрозы іх жыццю і здароўю. Акрамя таго, у краіне 1748 прыёмных сем'яў і 6299 апякунскіх.

**Алена КРАВЕЦ.**

На тэму дня




# ЯК АБАРАНІЦЬ АСАБІСТЫЯ ЗВЕСТКІ ДЗІЦЯЦІ

**Раскажуць у Нацыянальным цэнтры абароны персанальных даных (НЦАПД) 1 чэрвеня. Каб пакінуць сваё пытанне, трэба зайсці на сайт cpd.by і праз форму «Падаць зварот» напісаць пра хвалюючую праблему. Эксперты Цэнтра падрыхтуюць індывідуальныя адказы на ўсе запыты. У гэты ж дзень з 8.00 да 13.00 дырэктар НЦАПД Андрэй Гаеў правядзе асабісты прыём грамадзян.**



Ідэя арганізаваць такую акцыю нарадзілася са зваротаў людзей, сярод якіх шмат пытанняў датычыцца менавіта абароны асабістых звестак дзяцей. Часта дзеці не ведаюць і не прымяняюць у сваім жыцці важныя правілы лічбавай бяспекі. Яны актыўна карыстаюцца сацыяльнымі сеткамі, месенджарамі, мабільнымі дадаткамі і распаўсюджваюць пра сябе залішнюю інфармацыю: фатаграфіі, відэа, адрасы, нумары тэлефонаў, дату нараджэння, звесткі пра родных і блізкіх і іншыя асабістыя даныя, кажыць у Цэнтры.

— Інфармацыйная сфера імкліва развіваецца. А аўтаматызаваныя тэхналогіі па апрацоўцы і перадачы даных сёння ўкараніліся практычна ва ўсіх сацыяльных сферах. Гэта павышае ўразлівасць прыватнага жыцця дзяцей і часам стварае пагрозы незаконнага абароту персанальных даных непаўналетніх, — заўважыла **Вольга ШЫБКО, намеснік начальніка ўпраўлення адукацыйных паслуг і сувязяў з грамадскасцю НЦАПД.**

На жаль, дарослыя таксама часта распаўсюджваюць вельмі канфідэнцыяльную інфармацыю аб сваіх дзецях. Напрыклад, змяшчаючь у сацыяльных сетках фота дакументаў сына ці дочкі, публікуюць білеты на самалёт з асабістымі данымі. Многія, не задумваючыся, запаўняюць розныя анкеты і формы з данымі сваіх дзяцей, пры гэтым пагаджаючыся на апрацоўку даных. А іншыя ўказваюць даныя членаў сваёй сям'і, каб атрымаць чарговую картку лаяльнасці ў краме, падкрэслілі ў Цэнтры і нагадалі пра важнасць беражлівага і руплівага стаўлення да сваіх персанальных даных і паважлівага абыходжання з асабістымі звесткамі сваякоў.

**Ірына СІДАРОК.**

# ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ДЗЯЦІНСТВА — ПРЫЯРЫТЭТ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАВЫ

### Аб гэтым заявіў намеснік міністра адукацыі Аляксандр Кадлубай падчас рэспубліканскага старту летняй аздараўленчай кампаніі

**Цырымонія адбылася ў Нацыянальным дзіцячым аздараўленчым цэнтры «Зубраня».**

«У Год гістарычнай памяці мы ўспамінаем гераічныя падзеі нашай гісторыі, Вялікай Айчыннай вайны, — звярнуўся **Аляксандр КАДЛУБАЙ** да ўдзельнікаў урачыстасці. — Самае галоўнае з гэтага — Беларусь пераадолела ўсе выпрабаванні і хутка адбудавалася. У пасляваенныя гады былі створаны гэты ўнікальны аб'ект — аздараўленчы цэнтр «Зубраня». Палітыка па забеспячэнні дзяцінства з'яўляецца прыярытэтам беларускай дзяржавы. Сёння робіцца ўсё, каб вы маглі быць здаровымі, жыць у клопаце, цеплыні і ўтульнасці. Скончыўся навучальны год. Вы знаходзіцеся ў нашай жамчужыне дзіцячага аздараўлення, і наперадзе ў вас прыемнае правядзенне часу. Я жадаю, каб вы спазналі максімум сустрэч, завялі новыя знаёмствы, каб любоў да роднай Беларусі ў вашым сэрцы станавілася мацнейшай.



На лінейцы, прысвечанай адкрыццю летняй аздараўленчай кампаніі, таксама дадзены старт рэспубліканскай акцыі «Мары нараджаюцца — мары здзяйсняюцца!», уручаны сімвалічныя «білеты ў лета» прадстаўнікам усіх рэгіёнаў Беларусі, прадстаўлена пяць летніх праектаў, што рэалізоўваюцца ў «Зубраняці».

Намеснік міністра прыняў удзел у дыялогавай пляцоўцы «Ад якасці адукацыі да якасці жыцця». Падчас мерапрыемства працавалі «Клуб будучых выбаршчыкаў» (сумесна з ЦВК), «Урокі гісторыі: Высновы. Планы. Перспектывы» (сумесна з Беларускім таварыствам «Веды»), «Прафсаюз — гарант сацыяльнай абароны работніка» (з Беларускім прафесійным саюзам работнікаў адукацыі і навукі), «Інвестыцыі ў моладзь — інвестыцыі ў будучыню» (з БРСМ), «Мясцовае самакіраванне ў дзеянні» (з Мінскім аблвыканкамам і Мядзельскім райвыканкамам), а таксама дыялогавая пляцоўка «Сацыяльныя гарантыі ў галіне аздараўлення» (сумесна з Рэспубліканскім цэнтрам па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва).

Летнія аздараўленчыя лагеры з дзённым знаходжаннем масава пачынаюць сваю работу 1 чэрвеня, з круглас утачным знаходжаннем — на працягу першай дэкады чэрвеня. Усяго будзе працаваць 5,7 тыс. лагераў. У тым ліку 1,3 тысячы — круглас утачнага і 4,4 тысячы — дзённага знаходжання. На працягу лета ў Беларусі ў выхаваўчааздараўленчых установах змогуць адпачыць больш за 361 тысячу дзяцей.



Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

Скажыце, доктар...

# ТАЯМНІЧАЯ ШЧЫТАПАДОБНАЯ ЗАЛОЗА

### Каму варта яе правяраць і як на яе паўплывала каранавірусная інфекцыя?

**Паталогію шчытападобнай залозы мае 3,5 % беларусаў. Такі ж паказчык захваральнасці і ў іншых еўрапейскіх краінах. Самае распаўсюджанае захворванне шчытападобнай залозы ў Беларусі — гіпатэрыёз (зніжэнне функцыі шчытападобнай залозы), яго мае каля 130 тысяч чалавек. Штогод колькасць такіх хворых павялічваецца на тры-чатыры тысячы. Пры гэтым захворванне шчытападобнай залозы найчасцей жаночае: суадносіны жанчын і мужчын складаюць 5:1. Дарослыя хварэюць часцей, чым дзеці, прычым пасля 40—45 гадоў рызыка істотна павышаецца.**

**Ці ёсць спосабы прафілактыкі хваробы шчытападобнай залозы? Як часта і каму варта правярацца? Чаму не трэба здаваць аналіз на ўсе паказчыкі, якія маюцца ў лабараторыі, і што менавіта кантраляваць? Ці патрэбны нам дадатковы ёд? І хто ў групе рызыкі на захворванне шчытападобнай залозы? Пра гэта расказалі спецыялісты.**

## ЦІ ЁСЦЬ ЁДАДЭФІЦЫТ?

Яшчэ літаральна дзесяцігоддзе таму наша краіна адносілася да эндэмічнага рэгіёна, які меў дэфіцыт ёду. У сувязі з гэтым было шмат паталогій шчатападобнай залозы. Пераважна гэта эндэмічны і вузлавы валлякі. Пасля аварыі на Чарнобыльскай АЭС у Беларусі была распрацавана праграма прафілактыкі ёдадэфіцытных станаў для таго, каб зменшыць і наступствы аварыі, і ўплыў дэфіцыту ёду.

У выніку ў 2013 годзе Беларусь аднесена да краін, для якой характэрна адэкватнае ўжыванне ёду.

— Мы можам упэўнена канстатаваць, што ёдадэфіцыт сёння адсутнічае, як і захворванні, з ім звязаныя. Нашы прадукты ўтрымліваюць ёдаваную соль (а яе ў Беларусі 96 %), таму мы дастаткова прымаем гэтага элемента, і дадаткова яго ўжываць няма патрэбы, — адзначае **прафесар кафедры эндакрыналогіі Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Ала ШЭПЯЛЬКЕВІЧ.**

Пры гэтым у цяперашні час колькасць паталогій шчытападобнай залозы ў нашай краіне не змяншаецца. Гэта адно з самых распаўсюджаных эндакрынных захворванняў, па ўзроўні параўнальнае з цукровым дыябетам. Аднак змяняецца структура гэтай паталогіі.

— Калі раней пераважаў эндэмічны і вузлавы валлякі, то сёння на першыя месцы выходзяць хваробы, якія суправаджаюцца змяненнем функцыі шчытападобнай залозы. Гэта гіпатэрыёз, або зніжэнне выпрацоўкі гармонаў шчытападобнай залозы. А таксама захворванні, якія суправаджаюцца тырэатаксікозам — лішкам гармонаў шчытападобнай залозы, — кажа **намеснік галоўнага ўрача па арганізацыйна-метадычнай рабоце Рэспубліканскага цэнтра медыцынскай рэабілітацыі і бальнеалячэння Вольга САЛКО.**

Пасля аварыі на ЧАЭС у нашай краіне была выбудавана адна з найлепшых сістэм аказання медыцынскай дапамогі пацыентам з паталогіяй шчытападобнай залозы. Дакладна прапісаны алгарытмы накіравання пацыентаў ад узроўню да ўзроўню пры неабходнасці дыягнастычных даследаванняў.

— На раённым узроўні пацыенты могуць праходзіць базавыя даследаванні: гарманальныя і УГД шчытападобнай залозы. Сёння амаль усе медыцынскія ўстановы раённага ўзороўню аснашчаны адпаведным абсталяваннем і могуць праводзіць базавае выяўленне паталогій. Для далейшага ўдакладнення дыягназу — выканання, напрыклад, тонкаігольнай біяпсіі, пацыент накіроўваецца на абласны ці рэспубліканскі ўзровень. Ёсць усе магчымасці хірургічнага лячэння. Пашыраюцца магчымасці правядзення радыеёдтэрапіі пры дабраякаснай паталогіі. У нас выбудавана сістэма, маюцца ўсе неабходныя лекавыя прэпараты, — пералічвае Вольга Салко.

## ХТО Ў ГРУПЕ РЫЗЫКІ?

Спадчыннасць у паталогіі шчытападобнай залозы — вельмі важны аспект.

— Калі ў сям'і ёсць захворванні шчытападобнай залозы ці ў пацыента маюцца іншыя аўтаімунныя паталогіі, напрыклад, цукровы дыябет І тыпу, наднырачнікавая недастатковасць, рызыка захворвання шчытападобнай залозы ў такім выпадку павышаецца, — падкрэслівае Ала Шэпялькевіч.

Другая група фактараў рызыкі — лад жыцця.

— Сёння ўсё больш доказаў атрымліваюць асаблівасці харчавання чалавека. Акрамя таго, мае ўплыў фізічная актыўнасць, недахоп якой прыводзіць да лішняй вагі. А гэта ў сваю чаргу правакуе захворванні шчытападобнай залозы. Стрэс таксама з'яўляецца доказаным фактарам рызыкі захворвання шчытападобнай залозы. Сярод новых падыходаў — эндакрынныя дызраптары. Гэта штучныя рэчывы, якія найчасцей асацыіруюцца з выкарыстаннем пластыку. Эндакрынныя дызраптары ёсць і ў прадуктах, і ў вадзе, таксама гэта розныя хімікаты. Такія рэчывы ўбудоўваюцца ў шчытападобную залозу, валодаюць эндакрынным дзеяннем і могуць парушаць структуру клетак шчытападобнай залозы і прыводзіць да розных яе захворванняў, — расказвае Ала Шэпялькевіч.



На здароўе шчытападобнай залозы ўплывае забруджванне навакольнага асяроддзя, цяжкія металы, фарбавальнікі. У групе рызыкі таксама людзі, якім на момант аварыі на ЧАЭС было менш за 18 гадоў. Што ж рабіць, каб пазбегнуць праблем са шчытападобнай залозай?

— Калі ёсць спадчыннасць, вельмі разумна быць насцярожаным. У такім выпадку абсалютна лагічна паглядзець і структуру, і функцыю шчытападобнай залозы хоць бы адзін раз. Тым больш гэта важна, калі ёсць аўтаімунныя захворванне. Хранічны стрэс прыводзіць да такога ахоўнага стану, як атлусценне, бо чалавек як бы абараняецца павышанай масай цела. З-за гэтага мяняецца метабалізм, і сёння атлусценне — даказаны фактар рызыкі паталогіі шчытападобнай залозы. Тут пытанне прафілактыкі відавочнае: варта знізіць масу цела, — раіць суразмоўніца.

## ЯК ПАЎПЛЫВАЛА ПАНДЭМІЯ?

Нягледзячы на тое, што шчытападобная залоза малаадчувальная да інфекцыйных хвароб, каранавірусная інфекцыя, на жаль, і яе не абыходзіць.

— Найперш трэба вызначыць нашумелы падвостры тырэаідыт. У шпіталізаваных з COVID-19 пацыентаў распаўсюджанасць яго павялічылася істотна — у разы. Трэба сказаць, што шчытападобная залоза вельмі талерантная да інфекцыі. Але ковід настолькі спецыфічны, што мае рэцэптары для пранікнення ў шчытападобную залозу, што выклікае спецыфічнае запаленне, прычым бязбольнае. Калі раней падвостры тырэаідыт быў з яркімі клінічнымі праявамі, з хваравітай шчытападобнай залозай, то цяпер больш сцёртая карціна, што ўскладняе дыягностыку. Таму калі ёсць дыскамфорт у вобласці шыі, тэмпература, паказчыкі запалення павышаны, то варта задумацца пра тое, што гэта не толькі агульны інфекцыйны працэс, але і запаленне шчытападобнай залозы. Такога пацыента трэба накіроўваць на простыя даследаванні: УГД шчытападобнай залозы, узровень гармонаў і да эндакрынолага, — тлумачыць Ала Шэпялькевіч.

## САМАЯ РАСПАЎСЮДЖАНАЯ ХВАРОБА

Аўтаімунны тырэаідыт — захворванне, звязанае з вялікай колькасцю міфаў.

— Павышэнне ўзроўню антыцелаў — тая праблема, якой занепакоены многія ўрачы пярвічнага кантакту, а не толькі эндакрынолагі. Сёння мы ведаем, што аўтаімунны тырэаідыт прыводзіць да развіцця гіпатэрыёзу — зніжэння функцыі шчытападобнай залозы. Але само гэта захворванне не павінна выклікаць залішні непакой з боку пацыентаў і ўрачоў. Не трэба захапляцца дыягностыкай аўтаімуннага тырэаідыту, калі функцыя шчытападобнай залозы не зніжана, — выказала меркаванне Ала Шэпялькевіч.

Паводле яе слоў, толькі адна група пры нават невялікім зніжэнні функцыі шчытападобнай залозы патрабуе асаблівай увагі. Гэта жанчыны, якія плануюць цяжарнасць ці цяжарныя. У іх любыя змяненні, у тым ліку ўзроўню антыцелаў, патрабуюць прызначэння лячэння.

— Бо нават нязначнае павышэнне ўзроўню антыцелаў да пераксідазы можа быць неспрыяльнае да плоду, — звяртае ўвагу прафесар. — Падчас цяжарнасці ў цэлым павышаецца патрэба ў ёдзе. Калі ў звычайнай папуляцыі гэта 150 мкг, то пры цяжарнасці — 250 мкг. Жанчынам могуць прызначацца яшчэ і прэпараты ёду.

Пры гэтым важна памятаць, што лішак ёду можа прыводзіць да аўтаімунных захворванняў шчытападобанй залозы.

— Пасля аварыі на ЧАЭС у нас выбудаваны дакладны алгарытм дапамогі ў выпадку, калі ўзровень радыяцыйнага фону будзе павышаны. Важна разумець, што самастойныя дзеянні пачынаць неабходнасці няма, бо гэта можа нават нашкодзіць. Калі радыяцыйны фон павышаецца, па месцы жыхарства даецца спецыяльны лекавы сродак з высокім утрыманнем ёду, і гэта працэс арганізаваны, — дадае Вольга Салко.

## КАМУ ТРЭБА ПРАВЯРАЦЦА І ЯК?

— Калі гэта здаровы чалавек, то ніякага адмысловага алгарытму няма. З абцяжаранай спадчыннасцю варта рабіць УГД шчытападобнай залозы раз на два-тры гады. Лабараторныя даследаванні для выяўлення парушэнняў функцыі шчытападобнай залозы проста так рабіць не варта, а толькі пры цяжарнасці, пэўных сімптомах ці падазрэннях на захворванне, — кажа Вольга Салко.

— Што датычыцца даследаванняў цяжарных, то трэба рабіць не ўвесь спектр — 6-7 паказчыкаў, якія маюцца ў лабараторыі, а толькі асноўны паказчык — тырэатропны гармон. Калі ёсць адхіленні ў паказчыках тырэатропнага гармону, варта паглядзець антыцелы шчытападобнай залозы, найперш да тыроіднай пераксідазы. Але таксама аднойчы, каб высветліць, ці ёсць павышаны цітр і ці варта далей праводзіць назіранне. Калі цітр павышаны, гэта высокая рызыка парушэння функцый шчытападобнай залозы, — дадае **дацэнт кафедры эндакрыналогіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі Ірына БУРКО.**

На слыху

# ЗАФІКСАВАНЫ ПЕРШЫ ВЫПАДАК СМЕРЦІ АД ВОСПЫ МАЛПАЎ

**Першы выпадак смерці ад воспы малпаў зафіксавалі ўрачы ў Нігерыі, дзе налічваецца 21 хворы. Пра гэта 30 мая паведаміў мясцовы цэнтр прафілактыкі і кантролю захворванняў.**

«Па даных на 29 мая пацверджаны 21 выпадак, з якіх адзін лятальны. Памёр сарокагадовы пацыент са спадарожнымі захворваннямі, які прымаў імунапаніжальныя прэпараты», — гаворыцца ў паведамленні.

Першы выпадак заражэння чалавека воспай малпаў быў выяўлены яшчэ ў 1970 годзе. Аднак у апошнія месяцы ў розных краінах Еўропы, а таксама ў Амерыцы і Аўстраліі выявілі больш за 250 выпадкаў інфекцыі. У Сусветнай арганізацыі аховы здароўя адзначаюць, што з-за раптоўнага і адначасовага з'яўлення хваробы ў некалькіх краінах, у тым ліку ў неэндэмічных раёнах, вірус мог перадавацца незаўважаным на працягу нейкага часу.

На дадзены момант, як запэўніваюць медыкі, няма неабходнасці ў масавай вакцынацыі людзей ад воспы малпаў. Інфекцыя галоўным чынам перадаецца пры цесным фізічным кантакце, таму асноўнымі спосабамі кантролю захворвання застаюцца адсочванне кантактаў, расследаванне і ізаляцыя.

Воспа малпаў па клінічнай карціне нагадвае натуральную воспу, хоць праходзіць значна лягчэй. Інкубацыйны перыяд захворвання складае 5—21 дзень, у сярэднім — 6—13 дзён. Першыя праявы хваробы — фебрыльная тэмпература — больш за 38,5 °; дрыжыкі; інтэнсіўны галаўны боль; моцная слабасць; павелічэнне лімфавузлоў; міялгія — боль у мышцах і спіне.

У сярэднім праз 1—3 дні пасля першых сімптомаў з'яўляецца макулярны сып — плоскія чырвоныя плямы — часцей за ўсё на твары, далонях і ступнях, радзей — на слізістых абалонках рота, палавых органаў і кан'юнктыве — абалонцы вачэй. З часам элементы сыпу відазмяняюцца.

Хвароба доўжыцца 2—4 тыдні. Колькасць сімптомаў залежыць ад узросту, хранічных захворванняў інфікаванага і штама віруса. Заходнеафрыканскі падвід, які распаўсюдзіўся па Еўропе і ЗША, пераносіцца лягчэй, чым штам Конга (цэнтральнаафрыканскі). Вірус асабліва небяспечны для дзяцей, цяжарных жанчын і людзей са зніжаным імунітэтам (напрыклад, якія прымаюць прэпараты для імунасупрэсіі або якія пакутуюць на імунадэфіцыт).

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

### ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 412/С-27010 (назначение – здание специализированное для бытового обслуживания населения, наименование – здание бани), площадью 180,9 кв. м, расположенное по адресу: Мостовский р-н, Дубненский с/с, 33 около д. Заполье.
ЛОТ 1 расположен на земельном участке с кадастровым номером 424081700001000293 (назначение – для строительства и обслуживания здания бани), площадью 0,2359 га по адресу: Мостовский р-н, Дубненский с/с, 33, около д. Заполье. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земли, находящиеся в водоохранных зонах рек и водоемов, код – 2.4, площадью 0,2359 га; земли, находящиеся в охранных зонах электрических сетей, код – 5.2, площадью 0,0870 га; земли, находящиеся в придорожных полосах автомобильный дорог, код – 7.1, площадью 0,2359 га.
Начальная цена продажи – 13 138,78 руб. (тринадцать тысяч сто тридцать восемь рублей семьдесят восемь копеек) с учетом НДС. Сумма задатка – 1 313 руб. (одна тысяч триста тринадцать рублей)

Условия проведения аукциона – аукцион без условий

Продавец – ОАО «Агрокомбинат «Скидельский», Филиал «Дубно», 231602, Мостовский р-н, а. г. Дубно, ул. Октябрьская, 8, тел. 8-01515-606-68

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70

Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB301205008332 25001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 13 июня 2022 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion.
Объявление о проведении первого аукциона в газете «Звязда» от 25.08.2021 г.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед – с 12.30 до 13.18**

**Последний день приема заявлений – 09 июня 2022 г. до 15.00**

**Телефон для справок 55-87-71 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», https://grino.by/aukcion/**

---

## РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Управление механизации №91»

### ЛОТ № 1: АДМИНИСТРАТИВНОЕ ПОМЕЩЕНИЕ

с инв. № 500/D-708004811, 39,9 кв. м, адрес: г. Минск, ул. Комсомольская, 11-7. Изолированное помещение расположено в капитальном строении, которое является памятником историко-культурного наследия.

Начальная цена с НДС – 165 321,24 руб.
Задаток – 16 532,12 руб. Шаг аукциона – 5 %.
Штраф – 30 000,00 руб.

**Аукцион состоится 17.06.2022 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.**

Порядок оформления участия в аукционе, условия аукциона и полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона ino.by.

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900 100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Окончание приема заявлений и задатков – **15.06.2022 в 11.00.**

**Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

---

Центр Промышленной Оценки

• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

### ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ЭЛЕКТРОННОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. Сайт в интернете: www.cpo.by** |
| **Продавец** | **ОАО «Банк БелВЭБ», 220004, г. Минск, пр-т Победителей, 29** |
| **Оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б. www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов: изолированное помещение** (административное помещение) общей площадью 122,8 кв. м, инвентарный номер 100/D-118659, по адресу: г. Брест, ул. Московская, 332/3Б-3.
**Сведения о земельном участке с кадастровым номером 140100000001007006:** предоставлен на праве постоянного пользования (доля 1/3) для обслуживания административного здания общей площадью 0,2290 га.
**Начальная стоимость с НДС 20 % – 45 067,00 бел. руб.**

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, **получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»**

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней после электронных торгов. **Условия оплаты предмета электронных торгов:** 30 календарных дней со дня заключения договора купли-продажи

**Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **1,8 %** от цены продажи лота в течение 3 (трех) дней после проведения электронных торгов

